Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Натар'яла прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад вётарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 80 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрасу: іншагародзяе — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапіраскі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок шапіраскі перад тэкстам 1 р. — к.
За радок шапіраскі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпецыям на 50 проц. дарожай.
Зьмяк тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „
Публікацыі ЗАГО'ту—3 руб.	

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 167 (2355) Субота, 21-га ліпеня 1928 г.

Палітыка партыі на вёсцы застаецца бяз зьмен.

Наша партыя заўсёды ставіць карэнныя пытаньні бягучай палітыкі ва ўвесь рост, не затушоўваючы іх ценявых, шкодных бакоў. Партыя можа гэта рабіць, не баючыся направільнага тлумачэньня і злорадасьці варожага асяродку, бо ў асноўным яе палітыка правільна, у асноўным краіна, пад кіраўніцтвам партыі, няўхільна ідзе па шляху гаспадарчага, сацыялістычнага росту.

«Магчымасьць труднасьцяй на хлебным фронце» закладзена ў самой структуры нашай сельскай гаспадаркі, у яе «распыленасьці, дробнасьці, адсталасьці». За мінулыя гады гаспадарчай працы мы не змаглі значна зьмяніць гэтую структуру, партыя толькі зараз (пасьля XУ зьезду) шчыльна падышла да гэтай задачы. Таму «магчымасьць труднасьцяй» пры неватарых умовах лёгка можа абярнуцца ў «рэальнасьць». Гэта і стварылася ў мінулых хлебазагатоўках. Пленум ЦК, які нядаўна адбыўся, падрабязна пералічвае прычыны, якія парадзілі крызіс на хлебным фронце. Прычыны былі і аб'ектыўна-гаспадарчыя, і памылкі плянавага кіраўніцтва, і недастача загатоўчых арганізацый.

Партыя ня раз зазначала, што нашымі памылкамі зараз-жа карыстаюцца капіталістычныя элементы. Труднасьці на хлебным фронце былі скарыстаны кулакамі і спекулянтамі. Скарыстаны ня толькі эканамічна, але і палітычна.

Надзвычайныя меры, выкліканыя хлебнымі труднасьцямі, былі неабходны. Недабор хлеба мог выклікаць агульны гаспадарчы крызіс—партыя не магла на гэта пайсьці. Але надзвычайныя меры стварылі крызіс у дачыненьнях з сялянствам, стварылі пагрозу змычкі з вёскай.

Гэтымі мерамі пры наўмелым, часта скажоным іх выкарыстаньні былі закрануты ня толькі кулакі, але часткова і сераднякі. І тут справа ня ў колькасьці пакрыўджаных, а ў якасьці крыўды, у тым водгуку аб абыходзе дварою, ад поўраўвёрсткі і г. д., які ўтварыўся на вёсцы. Гэты водгук набыў форму «контрэвалюцыйнае балбатні аб адмене нэп'у, раздуваемай кулацтвам.

Пленум ЦК са ўсёю рашучасьцю адзначае гэтую контр-рэвалюцыйную балбатню. Пленум ЦК заяўляе, што «нэп зьяўляецца такой палітыкай пралетарскае дзяржавы, якая эканамічна і палітычна поўнасьцю забясьпечвае нам магчымасьць пабудовы фундаманту сацыялістычнае эканомікі» (Ленін).

Партыйная палітыка на вёсцы ў асноўным застаецца бяз зьмен. Гэта—палітыка апоры на беднату, трывалага саюзу з серадняком і наступу на кулака.

У падмацаваньне гэтае клясавае ўстаноўкі нашае палітыкі на вёсцы Пленум ЦК высоўвае шэраг практычных мер у будучых хлебазагатоўках, якія (меры), в аднаго боку, нішчаць памылкі і скажэньні асноўнае лініі ў мінулай кампаніі, а з другога—намячаюць новыя эканамічныя крокі да задаволеньня інтарэсаў беднаты і серадняка.

Рэвалюцыйная законнасьць на вёсцы, парушаная ў шэрагу месцаў практыкай надзвычайных мер, павінна быць адноўлена і ўмацавана неадкладна. Шляхам энэргічнае барацьбы на вёсцы партыя павінна выправіць шкоду, учыненую памылкамі, павінна ліквідаваць пагрозу змычцы, узмацніць палітычную актыўнасьць беднаты і замацаваць саюз з серадняком. Гэта зараз важнейшая задача, якая забясьпечвае «ажыцьцяўленьне пастаноў XУ-га партыйнага зьезду ў справе далейшага наступу на капіталістычныя элементы на вёсцы».

ПАСТАНОВА СНК СССР АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ХЛЕБАЗАГАТОВАК НОВАГА ЎРАДЖАЮ (1928 г.).

МАСКВА, 19-7. Дзякуючы кепскаму ходу хлебных загатовак у сярэдзіне мінулай зімы і ўзьнікшых у сувязі з гэтым вялікіх цяжкасьцяў у дастаўцы краіне хлеба, урад Саюзу ССР быў прымушаны ўжыць, пачынаючы з студзеня бягучага году, рад надзвычайных захадаў для ўмацаваньня хлебазагатовак. Гэтыя захады ўраду Саюзу ССР прышлося ўжыць дзеля таго, што іншымі спосабамі ў кароткі час, які заставаўся да пачатку вясновага бездарожжа, нельга было забясьпечыць насельніцтва краіны хлебам.

Гэтыя надзвычайныя сродкі ўплыву былі накіраваны супроць тых спэкулянтаў і буйных трымальцаў хлеба ў вёсцы (кулакоў), якія імкнуліся выкарыстаць у сваіх інтарэсах цяжкаватае становішча савецкай дзяржавы. Гібель, дзякуючы дрэннай пагодзе, значнай часткі зімовых пасеваў (больш 5 міл. дзесяцін) у галоўнейшых хлебных раёнах (Украіне, Паўночным Каўказе і інш.) і необходнасьць забясьпечыць перасеў іх яравым пасевам яшчэ больш пагоршыла становішча. Надзвычайныя сродкі ўплыву на хлебазагатоўках зачапілі ў шмат якіх раёнах ня толькі кулацкія, але і шырэйшы пласты сялянства.

Таму гэтыя часовыя захады, а таксама скажэньні і памылкі ў дзейнасьці мясцовых органаў па хлебазагатоўках, правядзеньне самаабкладаньня, распарадкаваньне пазыкі і інш. выклікалі незадаволеньне часткі сялянства. Недастатковае разьвіцьцё хлебазагатовак, асабліва в красавіка месяца пазбавіла ўрад магчымасьці дапамагчы ў поўнай меры тым бяднейшым пластом сялянства, якія купляюць вясной хлеб. Аднак, ня гледзячы на цяжкасьці ў забясьпечаньні краіны хлебам, урад Саюзу ССР зрабіў усе захады да таго, каб дапамагчы асноўнай серадняцка-бяднацкай гушчы сялянства абрабляць поле, перасеяць загінуўшыя азімыя, пашырыць яравы клін і тым самым забясьпечыць нармальную дастаўку на рынак хлеба новага ўраджаю.

Для гэтай дапамогі ўрад асігнаваў вялікія грашовыя сродкі і кволь 30 млн. пудоў насеньня. Па вестках, якія маюцца сёньня, ураджай гэтага году ў сярэднім па Саюзу ССР будзе лепшы за леташні. Сялянства, апіраючыся на павялічаны ўраджай сёлетняга году, мае магчымасьць задаволіць краіну хлеба-прадуктамі. Есьць надзеі, што ў надыходзячым годзе вёска будзе задаволена яшчэ ў большай меры і прамысловымі прадуктамі. Усё гэта стварае поўную магчымасьць посьпяховага разьвіцьця хлебазагатовак без усялякага ўжываньня якіх-небудзь надзвычайных захадаў. Досьлед мінулай хлебнай кампаніі абавязвае ўсе дзяржаўныя і кааператыўныя органы, у прыватнасьці хлебазарыхтавальныя, адносіцца з выключнай старанасьцю да ўсёй працы па хлебазагатоўках, праводзячы яе з поўнай увагай да паньту і патрэб асноўных сераднякоў бяднацкіх пластоў сялянства.

Побач з гэтым, урад Саюзу ССР робіць усе захады да таго, каб выправіць памылкі, дапушчаныя ў часе ўжытку надзвычайных захадаў. Урад знаходзіць, што адным з сродкаў посьпяховага разьвіцьця загатовак хлеба новага ўраджаю зьяўляецца падняцьце цэн на хлеб супроць існаваўшых у мінулым годзе. У мэтах заахвочваньня сялянства да пашырэньня пасоўных плошчаў і павялічэньня ўраджайнасьці, а таксама для забясьпечаньня нармальнага ходу хлебазагатовак,

САВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗУ ССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1) Усякае ўжываньне надзвычайных захадаў спыніць, і абавязаць усе органы Улады: а) зараз-жа спыніць усе спосабы прымусовага адбіраньня хлеба ў сялянства, як-то: абход гаспадараў і пратрусы з мэтай адбіраньня хлебных лішкаў, паза судовым зрышты і іншыя кары, а таксама прыцягненьне да судовай адказнасьці сялян за затрымку в продажу хлеба на рынак і г. д., б) зараз-жа спыніць усякага роду забаронныя захады ў адносінах рынкаў і ўнутры вясковага звароту, як: закрываньне хлебных рынкаў, выстаўленьне заградзільных атрадаў, прымус сялян, прывозячых на рынак хлеб, да продажу яго дзяржаўным ці кааператыўным арганізацыям і г. д.

2) Павысіць загатоўчыя цэны на хлеб.

Народнаму Камісарыяту Замежнага і Ўнутранага Гандлю Саюзу ССР зараз-жа ўстанавіць і апублікаваць новыя дыферэнцыяльныя цэны на хлебныя культуры. Пры ўстанаўленьні цэн Наркамгандлю Саюзу ССР павінен улічваць арыгінальнасьць розных раёнаў (розьніцу агульна-гаспадарчых умоў, суадносін культур і г. д). Павышэньне цэн павінна быць праведзена, прыкладам, у наступных памерах: на пшаніцу—на Украіне ў сярэднім—18 кап. на пуд, у Сібіры—10 кап. на пуд. У адносінах збожжа павышэньне павінна скласьці, напрыклад, у цэнтральнай чорназёмнай краіне—кала 18 кап. на пуд.

3 прычыны вялікай патрэбы ў фуражу, павялічыць цэны таксама на авёс і на іншыя кармавыя культуры.

3) Абавязаць Народны Камісарыят Замежнага і Ўнутранага Гандлю Саюзу ССР забясьпечыць своечасовае і правільнае задаволеньне сялянства прамысловымі таварамі ў адпаведнасьці з значэньнем кожнага раёну ў загатоўках хлеба і іншых сельска-гаспадарчых прадуктаў.

4) З прычыны вялікай шкоды для краіны ад расходаваньня вялікай колькасьці збожжа на самагонаварэньне, абавязаць усе органы Улады павесьці больш рашучую барацьбу з самагонаварэньнем.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР А. І. РЫКАЎ.

Намесьнік кіраўніка спраў Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Савету Працы і Абароны І. МІРОШНІКАЎ.

Масква, Крэмль, 19-УІ—28 г.

АДКАЗ АНГЛІІ НА НОТУ КЭЛЕГА.

ЛЁНДАН, 20-УІ. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «У сваім адказе на ноту Кэлёга Чэмбарлен выказвае надзею, што ў мэтах прадастаўленьня магчымасьці ўдзельнічаць у дагаворы аб забароне вайны магчыма большаму ліку краін, ім будзе разаслана адпаведнае агульнае выкладаньне. Агалошаны таксама тэксты адказу на ноту Кэлёга ўраду Аўстраліі, Паўднёва-Афрыканскага саюзу, Новай Зэляндыі і Індыі. Адказы Аўстраліі і Паўднёвай Афрыкі супадаюць з адказам ангельскага ўраду і розьняцца ад яго толькі тым, што ў іх не ўспамінаецца пра Лёкарно і пра райёны, у якіх Англія спэцыяльна зацікаўлена.

СССР І ПРАЭКТ КЭЛЁГА.

НЬЮ-ЁРК, 19-7. „Нью-Ёрк Іўнінг Уорлд" дамагаецца, каб урад ПАЗШ дабіўся ўдзелу савецкага ўраду ў прапанаваным Кэлёгам шматбаковым дагаворы «забараняючым вайну, як арудзьдзе нацыянальнай палітыкі».

У Саюзе ССР.

2-ГІ ЗОРНЫ ПЕРАЛЁТ 1928-Г.

1-Ы ПРЫЗ АТРЫМАЎ № АТРАД БЕЛАР. ВАЕН. АКРУГІ.

МАСКВА, 19-7. Адбылося ўрачыстае пасяджэньне прысьвечанае ўшанаваньню ўдзельнікаў 2-га зорнага пералёту 1928 году. Першы прыз і пераходны прыз ТДАВіяхіму СССР прысуджаны №-скаму атраду Беларускай ваеннай акругі, зрабіўшаму пад камандаваньнем Барантонава пералёт Дрэтунь—Веліж—Вязьма—Масква. Другі прыз прысуджаны №-скаму атраду Ленінградзкай ваеннай акругі, зрабіўшаму пад камандаваньнем Сафронава пералёт Троцк—Ноўгарад—Асташкаў—Ржэўск—Масква. Трэці прыз прысуджаны №-скаму атраду Ленінградзкай ваеннай акругі, зрабіўшаму пад камандаваньнем Кузьнэцова пералёт Троцк—Масква па тым-жа самым маршруце.

Хлебазагатоўкі.

МАСКВА, 18-УІІ. Па першапачатковых даных Наркамгандлю СССР усяго ў трэцяй пяцідзёўцы ліпеня загатоўлена 12.330 тон хлебапрадуктаў супроць 15.819 тон, загатоўленых у ранейшай пяцідзёўцы.

Рост паветраных шляхоў зносін СССР.

МАСКВА, 19-7. Савет грамадзянскай авіяцыі СССР заслухаў даклад аб пяцігадовым пляне разьвіцьця грамадзянскай авіяцыі СССР. Згодна плану, агульная сетка паветраных шляхоў зносін за пяць год у агульным выразьце в 11 з паловай тысяч кілёмэтраў да 40 тысяч кілёмэтраў. Праэктуецца 10 новых ліній.

Адчыненьне Інстытуту хэмічнай абароны.

МАСКВА, 19-УІІ. 19-га ліпеня адчыніўся Інстытут хэмічнай абароны, пабудаваны на сродкі, сабраныя ТДАВіяхімам у фонд: «Наш адказ Чэмберлену». Выступіўшы на ўрачыстым пасяджэньні т. Ушмліхт сказаў: «Жадаючы разьвіцьця ТДАВіяхіму, мы абавязаны знайсьці спосабы і сродкі да абароны заказу Кастрычніка. Капіталістычны сьвет разьлічвае выкарыстаць у будучай вайне навейшыя дасягненьні хэміі. Наша задача вывучыць сродкі пры дапамозе якіх будзем адбіваць удары. Адкрыцьцё Інстытуту газэра аб нашых імкненьнях уратаваць мілёны насельніцтва ад хэмічнай небясьпекі. Мы ўпэўнены,—закончыў Ушмліхт, што Рэвваенсавет СССР, прымаючы ад ТДАВіяхіму Інстытут зможа яшчэ ў большай меры падняць абароназдольнасьць краіны саветаў.

Апарат для перадачы адбіткаў на адлегласьці.

Масква, 19-7. Пленум цэнтральнага электратэхнічнага савету заслухаў тэлеадпаведнае прафэсара Чарнышова аб вынайдзеным апараце перадачы адбіткаў на адлегласьці. Апарат значна прасьцейшы замежнага і канструкцыя будзе гатовы да верасьня. У канструкцыі можна будзе паставіць пробную эксплёатацыю.

Згода між Мукдэнам і Нанкінам непакоіць Японію.

ЯПОНСКАЕ ВОЙСКА ЗАСТАЕЦЦА Ў МАНЧЖУРЫІ

ТОКІЁ, 19-7. Узрастаючая магчымасьць кампрамісу паміж Мукдэнам і Нанкінам на падставе прызнаньня гаміндапаўскага сьцягу і 3-х прынцыпаў Сун-Ят-Сэна паўночцамі, назначэньне Чжан-Сюэ-Ляна старшынёю Манчжурскага палітбюро і г. д. вельмі сур'ёзна непакояць японскія афіцыйныя і палітычныя колы. «Цюгай Сюгио» паведамляе, што ўрад мяркуе ў бліжэйшыя дні зрабіць «папярэджаньне» Чжан-Сюэ-Ляну і нанкінскаму ўраду, з зазначэньнем на пастанову Японіі клапаціцца аб захаваньні свайго прэстыжу і сваіх інтарэсаў як у Манчжурыі, так і ва ўнутраным Кітаі. Водлуг слоў лібэральнай газэты «Ніці-Ніці», прымаючы пад увагу магчымасьць кампрамісу між Мукдэнам і Нанкінам, японская вайсковая ўлада пастанавіла затрымаць на неакрэсьлены час у Манчжурыі Квантунскі гарнізон.

Нанкінскі ўрад аб няроўных дагаворах.

ШАНХАЙ, 19-УІІ. «Шун-Бао» прыводзе наступную заяву аднаго з відных членаў нанкінскага ўраду: адносіны нацыянальнага ўраду аб зьнішчэньні няроўных дагавораў застаюцца бязьзменнымі і цьвёрдымі. Дзяржавы павінны ведаць, што такое аднадушнае жаданьне ўсяго Кітаю. Калі дзяржавы ня хочуць гэтага зразумець і хочуць упірацца і ставіць паранейшаму перашкоды к перагляду дагавораў, нацыянальны ўрад павінен будзе прысьпяшыць падзеі, прычым першым крокам да гэтага зьявіцца аднаўленьне дыплёматычных адносін з савецкім урадам.

Ангельскія гарнякі за нацыяналізацыю капальняў.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ КУКА.

ЛЁНДАН, 19-7. На сёнешнім пасяджэньні зьезду ангельскіх гарнякоў ухвалена рэзалюцыя па пытаньні аб нацыяналізацыі капальняў наступнага зьместу: «мы будзем і надалей праводзіць нашу прапаганду за нацыяналізацыю вугольнай прамысловасьці ў перакананьні, што нацыяналізацыя зьяўляецца першым і найбольш важным крокам у рэарганізацыі ангельскай вугольнай вытворчасьці». У спрэчках па гэтай рэзалюцыі Кук заклікаў гарнякоў адкінуць у бок мэтады капіталістычнай рацыяналізацыі і «міру ў прамысловасьці». Вячэрняе пасяджэньне канфэрэнцыі, на якім абмяркоўвалася становішча, якое стварылася ў Шотляндзкай фэдэрацыі гарнякоў, адбылося пры зачыненых дзьвярох.

СЬЛЁЗЫ ЧЭРЧЫЛЯ З ПРЫЧЫНЫ БЕСПРАЦОЎЯ Ў АНГЛІІ.

ЛЁНДАН, 20-7. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «учора вечарам міністар фінансаў Чэрчыль выступіў з прамовай, у якой заявіў, што новы рост безработыцы зьяўляецца крыніцай глыбокага расчараваньня для Ўраду. Палова ўсёй лічбы беспрацоўных кладзецца на 4 галіны прамысловасьці: вугольную, бавоўняна-папяровую, будаўляную і судна-будаўляную. Калі ня лічыць гэтых 4-х галін прамысловасьці, то беспрацоўе за апошнія гады скарацілася—неабходныя спэцыяльныя захады з беспрацоўем будуць агалошаны прэм'ер-міністрам на наступным тыдні.

ЗАБОЙСТВА АБРЭГОНА—СПРАВА РУК КЛЕРЫКАЛАЎ.

НЬЮ-ЁРК, 19-УІІ. Ворган Уоркэр парты „Дэйлі Уоркэр" прыпісывае забойства Абрэгона рэакцыйным клерыкальным элемэнтам Мэксікі. Па словах газэты, амэрыканскі пасланьнік у Мэксыцы Двайт-Мароў імкнуўся да таго, каб Абрэгон арыентаваўся на клерыкальных абшарнікаў і парушыў свае абяцаньні работнікам і сялянам. Маюцца ўсе падставы думаць, што, Двайт-Мароў дабіўся посьпеху ў сваім замысьле.

Калі клерыкал—фанатык забіў Абрэгона, то Двайт-Мароў—давераная Асоба кампаніі Маргана—узбройваў яго.

ПАХАВАНЬНЕ АБРЭГОНА.

НЬЮ-ЁРК, 19-7. Як паведамляюць з Мэксыко, Кайзэ апублікаваў заяву, у якой гаворыцца, што забойца Абрэгона прызнаўся, што дзейнічаў з рэлігійных перакананьняў. Капэо заяўляе, што паліцыя выкрыла змову каталікоў, якая прывяла да забойства Абрэгона. Аднак, факты, якія даводзяць удзел каталікоў у замаху, пакуль што не названы.

Учора адбылося пахаваньне Абрэгона, якому былі зроблены вайсковыя ўшанаваньні. Паўнамоцны прадстаўнік СССР выказаў жаль з прычыны забойства Абрэгона.

Спатканьне палітвязьнаў у Вене.

Паліцыя параніла дэманстрантаў.

БЭРЛІН, 19-7. У часе спатканьня ў Вене групы амністыраваных пралетарскіх палітзьняволеных, паліцыя акружыла вакзал і спыніла спатыкаўшым таварышам доступ. Пры спробе дэманстрантаў разарваць жывы ланцуг, паліцыя пусьціла ў ход гумовыя кіі. Шмат дэманстрантаў пакалечана.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Польскія гарнякі пагражаюць забастоўкай.

17 ліпеня г. г. у Катовіцах адбыўся зьезд польскіх гарнякоў з Кракаўскага, Домброўскага і Горна-Сілезкага райёнаў, які пастанавіў, што калі з 21 ліпеня г. г. плата не будзе падвышана, дык 25-таго-ж месяца адбудзецца аднадзённая забастоўка пратэсту. Калі-б гэта дэманстрацыя не мела пажаданьных для гарнякоў рэзультатаў, тады зьезд зьбярэцца зноў з мэтаю абвяшчэньня забастоўкі да здаволеньня жаданьняў гарнякоў.

„Бедэлсаюз" Ярэміча і Рагулі падрыхтоўваецца...

„Кур. Віленьскі" (№ 160) паведамляе, што 14 ліпеня г. г. у Вільні адбылося паседжаньне Бел. Камітэту „Сялян Саюзу", на якім пастаноўлена распачаць палітычную і арганізацыйную працу на абшары Віленшчыны і Навагрудчыны.

Падпал маёнтку.

У маёнтку Курта, Ворнянскай вол., учачы в 15 на 16 ліпеня г. г. здарыўся пажар. Згарэлі датла жылы дом уласніка маёнтку п. Сымановіча В. і яго-ж стадола.

Адміністрацыя ўстанавіла, што тут меў месца падпал, але выкрыць вінаватых не ўдалося.

Марачэўскі і Дашынскі ў Вільні.

Як паведамляе віленскае «Слово» (№ 161) 17 ліпеня г. г. у Вільню прыехалі інкогніто мін. публічных работ п. Марачэўскі і маршалак Сойму п. Дашынскі, якія адбылі кароткую нараду з паслом сойму поп-эсаўцам Пляўскім, праф. Эрэнфэйцам і віцэпрэзыдэнтам Вільні Чыжом.

Ліквідацыя „Праваслаўнай Беларусі".

Выдаваўшая апошнім часам у Вільні газэта праваслаўных хрысьціянскіх дэмакратаў „Праваслаўная Беларусь" зачынілася з прычыны малой лічбы падпішчыкаў.

За „Грамаду".

На дзесятым пікэтэры тракту, які ядзе з Вільні ў Шэшу, навыкрытыя „злачынцы" вывесілі на дрэве сьпяг з надпісам: «Жадаем выпушчэньня зьняволеных членаў «Грамады».

Зьняты сьцяг, паліцыя, як паведамляе, „Слово" (№ 161), пачала „энэргічнае следзтва".

Катастрофа самалёту.

Каля в. Пышкава, Влацлаўскага пав., упаў в вышыні на зямлю вайсковы самалёт і разьбіўся. Два лётнікі паранены.

„ШЧАСЬЛІВАЯ ПОЛЬШЧА".

У № 157 парыскай газэты «Ле Суар» Робэрт Турлі ў перадавіцы падае сваю размову з польскаю дзяячкаю Стэфаніяй Стэмпкоўскаю, якую ён бачыў у Варшаве.

С. Стэмпкоўская не схавала перад францускім журналістам сумнай праўды пра сваю бацькаўшчыну. Апавядаючы, між іншым, пра ганебны суд над 56 членамі Беларускай Грамады, яна сказала:

«У Беларусі зямля належыць вялікім уласьнікам... Грамада—гэта беларуская сялянка—была вялікім шкадам для ўласьнікаў. Паўна, што з гэтай прычыны міністр юстыцыі Мэйтовіч, род якога належыць да клясы гэтых уласьнікаў, арганізаваў той суд».

Добра паінфармаваная грамадзянка праўдзіва намалявала, як вольныя землі Зах. Беларусі раздаюцца польскім жаўнерам—асаднікам.

Беларускі-ж селянін не атрымлівае нічога. Стэмпкоўская здаецца зусім нармальным, што польскія беларусы цягнуцца да таго ўраду, які даў іх братом больш, г. ё. да савецкага ўраду.

Не забыла Стэмпкоўская ілюстраваць сучасны лад у Польшчы фактамі з апошніх выбараў у польскі сойм. Гэтыя выбары «мала адбіваюць народныя жаданьні. Яны былі падроблены шляхам падману і тэрору».

На запытаньне карэспандэнта, ці доўга, на яе думку, пратрымаецца Пілсудзкі, — Стэмпкоўская адказала, што ён мае за сабою падпору ў несьвядомасьці польскіх сялян.

Так, кажа Стэмпкоўская, расейскія сяляне гаварылі пра цара Мікалая Другога. Але гэта ім не пашкодзіла, як відома, разам з работнікамі пакончыць з царатам.

(Украіньскі Вісьці, № 71, 1928 г.).

Тайныя нарады ў Бухарэсьце.

Дзе Пілсудзкі?

ВЕНА, 19-УІІ. Як паведамляе Бухарэсцкая газэта «Лупта», прыезд францускага генэрала Лерона ў Румынію стаіць у сувязі з ваеннымі перагаворамі між Францыяй, Польшчай і Малой Антантай. Газэта паведамляе, што да прыбыцьця ў Бухарэст Лерон вёў таксама перамовы ў Варшаве. Венская і Будапэштская прэса прыводзіць шырака распаўсюджаныя, на супроць афіцыяльным запярэчаньням, чуткі аб тым, што ў Румыніі інкогніто знаходзіцца Пілсудзкі.

У ЛІТВЕ.

Новыя арышты камуністаў

У сувязі з апошнімі арыштамі камуністаў у Шаўлях паліцыя арыштавала рэзэрвіста Т. Фрыдмана, паўафіцэра Л. Кашына, А. Мілейку, Я. Масіцнаса і Я. Тэйноўскага. Усіх арыштаваных аддаюць пад суд.

Арышты за ўдзел у паўстаньні.

Паліцыя арыштавала гэтымі днямі б. памоцнікаў б. пасла літоўскага сойму Кедыся, які хацеў у свой час падняць паўстаньне проці ўраду Вальдэмараса ў Аліце. Арыштаваны: А. Навіцкі, В. Салюца, П. Кварацеюс, Л. Мэрэканскі і І. Янулевіч. Арыштаваных будуць судзіць за ўдзел у паўстаньні вайсковым судом.

ПОШУКІ ЗА „ЛАТАМАМ"

ОСЛО, 19-7. На Мядзьвежай выспе былі зроблены новыя пошукі ў сувязі з чуткамі аб тым, што два рыбакі знайшлі там сьляды аэраплана, як прыпушчалася—„Латама". Пошукі не далі ніякіх вынікаў. Сёньня ў Кінгзбэй вярнуўся совецкі лётчык «Красін», маючы на борце ўратаваных удзельнікаў экспэдыцыі «Італіі». Вонкавы выгляд уратаваных добры, за выключэньнем Мадьяно, якому як паведамляюць, прышлося ампутаваць нагу. Уратаваных Ўдзельнікі экспэдыцыі былі спатканы нымі прывітаньнямі з боку [illegible] ды-Міляна".

„Красін" у [illegible]

РЫМ, 20-7. Агенцтва [illegible]ляе: „Красін" прыбы[illegible] даў „Чыта ды Міл[illegible] рыю ўдзельнікаў [illegible]

Эгіпт распушчан[illegible]

ЛЁНДАН, 20-7. Аге[illegible] дамляе: учора вечарам [illegible] вюх палат Эгіпту ўручы[illegible] окага дэкрэту аб роспуску ты дэпутатаў на 3 гады.

С. Гусеў.

Падрыхтоўка другога зьезду.

(Успаміны).

Пасьля шэрагу пакут і розных здарэньняў, я перабраўся праз граніцу каля Валочыску, але, маючы мала грошай, я затрымаўся ў Львове, адкуль паслаў у „Искру" апісаньне растоўскай дэманстрацыі.

Здаецца, на наступны дзень пасьля прыезду ў Жэневу мяне пазнаёмілі з Плеханавым і Патрэсавым. На жаданьню Плеханава пастаноўлена было, каб я зрабіў публічны даклад аб растоўскіх падзеях (лістапад 1902 году—сакавік 1903 году). Даклад меў дзьве мэты: папершае, даць бой эсэрам, якія спрабавалі прыпісаць частку «заслуг» у растоўскай забастоўцы сабе, падругое, сабраць грошы для «Искры». Абедзьве мэты ўдаліся.

На сьвяткаваньне 1 мая быў накіраваны ў Цурых, дзе зрабіў два даклады аб растоўскіх падзеях і аб Першым Мая.

Хутка пасьля першага мая я паехаў у Кляран на беразе Жэнеўскага возера, дзе ў той час знаходзіўся Плеханаў. Тут я меў магчымасьць наглядаць Плеханава ў часе штодзённых спатканьняў у яго прыватным жыцьці. І гэтыя нагляды крыху халадзілі тыя пачуцьці глыбокай пашаны перад ім, якія мяне агарнулі, пакуль не пазнаў яго бліжэй. Найбольшае ўражаньне зрабілі на мяне не яго «генэральскія» замашкі ў адносіне да маладых таварышоў, а той факт, што прыватнае яго жыцьцё было зусім «пустое» і ня мела ніякай сувязі з яго грамадзкай працай. Было быццам два Плеханавы: адзін—буйнейшы тэарэтык і папулярызатар марксізму, дасканалы палеміст і прамоўца, хоць і злоўжываў правам «цешыць» публіку анэкдотамі, другі—расейскі барын, які любіць абкружаць сябе вясёлай моладзьдзю, спрод якой ён браў на сябе волю ініцыятара розных «пацешных» забаў. Гэты другі Плеханаў не цярпеў, каб пры ім гаварылі на палітычныя тэмы. Некалькі разоў я спрабаваў пачынаць гутарку пра эсэраў, пра рабоч дзяльцоў, пра зьезд, але другі Плеханаў лоўка ўхіляўся ад яе, пачынаючы жартаваць, або раскажа якінебудзь анэкдот.

У канцы мая мы вярнуліся ў Жэневу, дзе ў гэты час пачалі зьяжджацца дэлегаты на зьезд. Для дэлегатаў было склікана некалькі папярэдніх нарад, в якіх у мяне засталіся ў памяці дзьве: адна—па пытаньнях аб дачы паказаньняў, а другая—па пытаньні аб папулярнай газэце.

На першай дакладчыкам быў Дойч, які даводзіў, што найлепшая тактыка—не даваць жандарам ніякіх паказаньняў. Пасьля дакладаў некалькі хвілін ніхто ня браў слова, ня гледзячы па запросіны старшыні. Мне было нейк нялоўка за таварышоў, бо вышла так, быццам прыехаўшы банцца выступаць перад правадырамі, і я напрасіў слова сабе. Я не пярэчыў супроць вспоўнага палажэньня дакладу, а толькі паставіў два запытаньні: 1) ці ня можа быць такога здарэньня, калі арганізацыя знойдзе патрэбным дачу паказаньняў, напрыклад, пры абвінавачаньні сацыял-дэмакрата ў тэрарыстычным акце і прыналежнасьці да партыі эсэраў, 2) ці можа быць ужыта тактыка поўнага адмаўленьня ад паказаньняў у тых выпадках, калі арганізацыя знойдзе патрэбным выкарыстаць судовы працэс для палітычных мэт, шляхам прамоў падсудных, для чаго могуць аказацца патрэбнымі некаторыя паказаньні.

Адказваў мне нейкі невядомы мне чарнявы малады чалавек у пэнсне і з вельмі доўгай шэялюрай. Адказ быў дадзен у вельмі вострай форме. Але гэта ў той час было прынята, і мяне ня зьдзівіла. Толькі нянрыемнае ўражаньне на мяне зрабіла нотка задаваньня, якая адчувалася ў адказе.

Вось якім было маё першае спатканьне з Троцкім. Яно ня выклікала ў мяне да яго ніякіх сымпатый.

Другі слод ня быў такім шматлюдным, як першы. Былі там Плеханаў, Засуліч і, здаецца, Патрэсаў, а таксама некалькі дэлегатаў. У той час я яшчэ ня ведаў, што пытаньне аб папулярнай газэце было „лакмусавай паперкай" у адносіне да дэлегатаў, якія не належалі да арганізацыі «Искры» і якіх у Жэневе яшчэ ня ведалі як сьлед. Лічылася, што прыхільнікі папулярнай газэты—нацыльвёрдыя іскраўцы. Я-ж прыехаў з думкаю аб неабходнасьці выданьня такой газэты заграніцай, бо вопыт «Южного Рабочего», якая выдавалася ў Расеі, мае пераканаў, што значна цяжэй наладзіць рэгулярны выпуск і распаўсюджаньне газэты ў Расеі, чымся арганізаваць яе транспарт з-за граніцы. Ды і газэта заграніцай будзе весьціся, бясспрэчна, лепш і больш жвава. І ў працягу поўгадзіны я ўсімі спосабамі стараўся давесьці неабходнасьць існаваньня папулярнай газэты. Плеханаў, які стаяў за выданьне папулярнай газэты поруч з «Искрой» і шукаў сабе ў гэтым пытаньні саюзьнікаў, пасьля маёй прамовы скорагаворкай скрозь свае пышныя вусы прамовіў: «Брава! Брава»!

Пытаньне аб папулярнай газэце разьбіралася яшчэ раз на прыватнай нарадзе дэлегатаў у пачатку зьезда ў Брусэлі. Тут я зноў „шчапіўся" з Троцкім, які ў гэтым пытаньні ішоў супроць Плеханава. (Па іроніі гісторыі іменна Троцкі першы пачаў выдаваць папулярную газэту—венскую «Правду»).

На зьезьдзе-ж пытаньне аб папулярнай газэце выплыла ў канкрэтнай форме пры абмеркаваньні пытаньня аб „Южном Рабочем". Я першы раз убачыў тады, што палітычныя меркаваньні могуць карэнным спосабам зьмяніць пастаноўку і вырашэньне тэхнічнага пытаньня. Па тэхнічных меркаваньнях папулярную газэту, даступную шырокім пластом рабочых, выдаваць было неабходна. Але па палітычных меркаваньнях можна было ў той момант дапусьціць выданьне толькі аднаго цэнтральнага органу. Палітычная неабходнасьць замяніць тэхнічную, —вось якім быў для мяне адзін з першых палітычных вурокаў зьезду, які я цьвёрда запомніў.

Ужо набліжаўся час зьезду, а я ўсё яшчэ ня бачыў Леніна, якога ў Жэневе ня было. Дзён за дзесяць перад зьездам я меў з ім спатканьне.

Адпойчы група дэлегатаў зьезду (у тым ліку і я) ішла па вуліцы і на заваросце спаткаліся з Уладзімерам Ільічом і Надзеяй Кастусёвай.

Больш усяго мяне зьдзівіла ў Леніне пры першым спатканьні ўменьне адначасна весьці размову з некалькімі асобамі. Ён засыпаў

Тыдзень абароны ў БССР.

Вораг нас не за палохае.

(Полацак).

Каля 11-ай гадзіны раніцы працоўныя Полацку сабраліся на аэрадром, а над галовамі ўжо лётаў самалёт, які праз некалькі хвілін, падымаючы пясок, сеў на шырокі пляц аэрадрому.

Не зважаючы на чырвонаармейскія пасты, маса народу прабілася да самага самалёту. Некаторыя нават упяршыню так блізка бачылі гэтую сталёвую птушку.

Адчыняецца мітынг. Льюцца словы прывітаньня; гаворыцца аб значэньні «Тыдню абароны». Пасьля лётнікі тлумачылі сабраўшымся аб значэньні авіяцыі як у час вайны, так і ў мірным жыцьці.

Затрашчаў матор. З лёгкасьцю ластаўкі самалёт узьняўся над натоўпам працоўных. Усё вышэй, вышэй; лётнік пачаў паказваць сваё мастацтва: мёртвыя петлі, кругавыя палёты і г. д.

Сотні пар вачэй сочаць за сталёвай птушкай, аж жах браў ад усіх тых штук, якія выраблялу лётнік з самалётам. Хутка прыляцеў другі самалёт, і праз некаторы час яны абодвы апусьціліся на зямлю.

Зноў каля самалётаў сабраўся народ. Хочацца іх ня толькі паглядзець, але і памацаць рукамі.

Увечары над горадам паказалася пяць самалётаў, з якіх скінулі ракеты,—доўгія дымавыя хвасты закружыліся ў паветры, а па вуліцах гораду праходзіла інсцэніроўка газавай атакі.

Атрады ячэек ТДА-Авіяхіму досыць добра паказалі, як трэба будзе баранціца ад паветрана-хэмічнага нападу.

— Не запалохаюць нас ніякія ворагі,—гаварылі працоўныя Полацку па скончэньні інсцэніроўкі. Буржуазея атрымае належны адпор, калі паспрабуе напасьці на дзяржаву рабочых і сялян.

Тыдзень абароны ў Магілеве.

Да «Тыдню абароны» дзелавіта і сур'ёзна падышлі як арганізацыі, так і шырокія працоўныя масы Магілеву.

У суботу, 14 ліпеня, у Дзяржтэатры імя Ігнатоўскага адбылося ўрачыстае пасяджэньне пленуму гарадзкога савету, з удзелам членаў прафсаюзаў, членаў ТДА-Авіяхіму жаночых і мужчынскіх хімкаманд і гурткоў «Чырвонага Крыжу».

На пленуме з дакладам аб значэньні і мэтах «Тыдню» выступіў памоцнік начальніка №-скай стралковай дывізіі т. Бурак.

У дакладзе т. Бурак выявілася, што на Магілеўшчыне налічваецца каля 15.000 сяброў ТДА-Авіяхіму, каля 75 ячэек гэтага таварыства раскіданы па адным Магілеве.

Маюцца ўзорныя ячэйкі ТДА-Авіяхіму на будаўніцтве чыгункі „Росмосдор", пры друкарні „Саха і Молат", у скурнікаў і інш.

Наступнаю раніцой, 15-га, рабочыя і служачыя Магілева, арганізаваныя ў стромкія калёны, з штандарамі і аркестрамі, накіраваліся на масавае сьвята ў Прыднепроўскія лягеры.

У лягеры адбыўся мітынг, на якім выступіў з прамоваю намесьнік начальніка РСЧА т. Пугачоў.

У лягеру былі арганізаваны [illegible] і баскетбол, конная [illegible]ніцтвы; спэцыяльна[illegible] паказаў фігур[illegible]аючы прысьвеча[illegible]

[illegible]шло бадзёра, [illegible]ягго ўдзель[illegible] чалавек— [illegible]лева.

[illegible] з посьпехам пра[illegible]ужачны вбор.

Юр.

Пара прачнуцца і за працу ўзяцца.

(Ячэйка ТДА-Авіяхіму Нар. Кам. Гандлю).

Гэтымі днямі было праведзена абсьледаваньне дзейнасьці ячэйкі ТДА-Авіяхіму Нар. Кам. Гандлю БССР.

З матар'ялаў абсьледаваньня відаць, што да красавіка месяца ячэйкі ТДА-Авіяхіму ў Нар. Кам. Гандлі БССР зусім не існавала.

Да гэтага часу члены ТДА-Авіяхіму Нар. Нам. Гандлю абслугоўваліся сумесна з тэкстыльгандлем, сольсындыкатам, продасілкатам і шэрагам іншых трэстаўскіх аб'яднаньняў.

І толькі з красавіка было даручана арганізаваць у Нар. Кам. Гандлю ячэйку ТДА-Авіяхіму.

Для вядзеньня працы ў ячэйцы, мясцком Нар. Кам. Гандлю быў выдзелен упаўнаважаны, але апошні лёг у больніцу і ячэйка... сьпіць.

Ніякая праца зараз не вядзецца, арганізацыйна ячэйка не афармлена, запазычанасьць па сяброўскіх узносах за час з 1-га студзеня 1928 г. вялікая. І толькі на паперы, значыцца 22 чал. Састаяць сябрамі ячэйкі ТДА-Авіяхіму 35 служачых.

Праўда, некаторы час таму назад было пастаноўлена аб'яднаць ячэйкі ТДА-Авіяхіму Нар. Кам. Гандлю сумесна з Дзяржгандлем, але... летняя сьпячка перашкодзіла.

Менскаму акруговаму савету ТДА-Авіяхіму трэба зацікавіцца ячэйкай ТДА-Авіяхіму Нар. Кам. Гандлю, дапамагчы ёй і тым самым абудзіць яе ад доўгага летняга сну.

М. А.

ТДА-Авіяхім у Віцебску.

ПРАВЯДЗЕНЬНЕ „ТЫДНЮ АБАРОНЫ".

Напярэдадні «Тыдню абароны» ў горадзе па саюзах, па садох, прадпрыёмствах кіпіць праца.

Ідзе падрыхтоўка, адбываюцца агульнасаюзныя сходы, прысьвечаныя «Тыдню абароны».

На ўсіх сходах былі ўхвалены рэзалюцыі і пастановы аб адлічэньні з заработку ў карысьць фонду абароны краіны.

Ва ўсіх установах і прадпрыёмствах былі выпушчаны спэцыяльна прысьвечаныя гэтаму дню насьценныя газэты.

Напярэдадні „Тыдню абароны" 14-га ліпеня ў памяшканьні Дому Чырвонай армі адбылося ўрачыстае пасяджэньне пленуму Віцебскага ТДА-авіяхіму сумесна з гарадзкім актывам і начскладам запасу гораду, дзе акрамя дакладу аб тыдню абароны, адбыўся выпуск скончэўшых курсы—кіраўнікоў гурткоў, начхімкаманд і сувязі.

У першы дзень «Тыдню абароны» адбыліся камандныя стралковыя выпярэдніцтвы гарадзкіх гурткоў вайсковых і стралковых ведаў. Асабовыя і стралковыя выпярэдніцтвы піянэраў, пазаўчышыя стралковыя выпярэдніцтвы.

З 15-га па 22-га ліпеня адбыліся стралковыя выпярэдніцтвы сяброў ТДА-авіяхіму Высачанскага раёну.

15-га ліпеня ў першы дзень „Тыдню абароны" адбыўся выхад у поле ўсіх гарадзкіх гурткоў вайсковых ведаў і гурткоў першай дапамогі Чырвонага Крыжу, для разьвязваньня тактычнай задачы.

У перыяд тыдню па буйных ячэйках праведзены стралковыя выпярэдніцтвы і выхады гурткоў у поле.

З 15-га па 22-га ліпеня—выезды прадстаўнікоў гарадзкіх ячэек ТДА-авіяхіму сумесна з таварыствам „Культзмычкі" у падшэфныя сельсаветы.

22-га ліпеня, у апошні дзень «Тыдню абароны» адбудзецца агульна-гарадзкая дэманстрацыя працоўных і служачых у лягеры імя Варошыскага.

У працягу «Тыдню абароны» праводзіцца скарбоначны збор, а на ўсіх тэатрах, кіно, клюбах, садох і г. д. былі праведзены платныя спэктаклі, кіно-сэансы, вечары і гуляньні на карысьць фонду абароны краіны. Акрамя гэтага, праводзіцца збор сродкаў па прадпрыёмствах і ўстановах на падпісных лістох.

СТАН АРГАНІЗАЦЫІ

Віцебскі ТДА-авіяхім хаця і не перажывае буйнага росту, але кожны шэрагі яго папаўняюцца і за апошні год узрасьлі да 20.216 чал.

Растуць і ячэйкі. Іх цяпер ня 304, як было у мінулым годзе, а 335.

Апошні год працы даў значнае палепшэньне і палепшаньне пастаноўкі справы ў гурткох—вайскова-хэмічных, санітарных, стралковых і лётна-спартыўных. Гэтымі гурткамі ахоплена 47,9 проц. усяго складу арганізацыі.

Праца за апошні год праведзена вялікая: паветра-хэмічная інсцэніроўка, двухдзённыя манэўры агульна-гарадзкіх гурткоў вайсковых ведаў і інш.

Акрамя гэтага, праводзіліся выхады вайсковых гурткоў у поле для разьвязваньня тактычных задач, пры ўдзеле гурткоў першай дапамогі Чырвонага Крыжу. Выходзілі гурткі ў поле і для праверкі праведзенай зімой тэарэтычнай вучобы і для прахаджэньня курсу летніх заняткаў. Вялікая ўвага ў практычнай працы ўдзялялася стралковай справе. На гэтых днях адчыняецца стралковы цір у гарадзкім рабочым садзе.

У гурткох ідзе падрыхтоўка на снайпэроў—лепшых стралкоў. З снайпэроў будзе потым арганізавана снайпэроўская каманда.

Шэраг вытворчых ячэек нашага гораду мае пэўную плянавую ўстаноўку ў працы. Некаторыя ячэйкі праводзяць працу па ліквідацыі нянісьменнасьці праз адпаведныя каманды ТДА-Авіяхіму.

Ёсьць прымітыўнага ўзору стралковыя ціры, абсталяваны вайсковыя і ТДА-Авіяхім куткі, шэраг школьных ячэек; пры вэт. інстытуце, электра-мэханічным тэхнікуме і некалькі пры сямігодках, дзе праца праводзіцца выключна па мэдзялябудаўніцтву.

Неабходна адзначыць, што некаторыя ячэйкі, якія раней не праводзілі ніякай працы, да „Тыдню Абароны" падцягнуліся і ўзяліся за правядзеньне правільнай практычнай працы сярод сваіх сяброў.

У райёнах праца абстаіць таксама ня зусім кепска.

У райаддзяленьнях: Гарадзецкім, Ляднянскім, Сураскім, Кузьняцоўскім, і Бешанковіцкім праца праводзіцца здавальняюча; у рэшце райёнаў праца кульгае.

За большасьцю райаддзяленьняў лічыцца вялікая запазычанасьць перад акруговым саветам ТДА-Авіяхіму, як па сяброўскіх узносах, так і па рэалізацыі літаратуры, значкоў, марак і г. д. Выбарчы апарат мала актыўны. Адсутнасьць плянавых прапаўнікоў у райаддзяленьнях заўлечна тормазам у кіраўніцтве працай нізавых сялянскіх ячэек.

Акруговы савет прымае ўсе захады праз акругком і райком партыі аб ажыўленьні выбарчага складу райаддзяленьняў ТДА-Авіяхіму.

У мінулым годзе у Тыдню Абароны мы мелі значны посьпех у росьце членства ячэек, гурткоў і г. д., а посьпех гэты потым слабо замацавалі.

Наша задача,—у гэты тыдзень абароны ня толькі ўцягнуць вялікі лік працоўных, але наша задача без асаблівага шуму, пасьля тыдню абароны праводзіць систэматычную практычную працу па ваенізацыі мас працоўных і служачых нашага гораду.

Л. Эйцінгін.

САМААБКЛАДАНЬНЕ ПАЛЕПШЫЦЬ ЖЫЦЬЦЁ ВЁСКІ

Першым чынам самаабкладаньне штурханула да працы сяброў нашага Курганскага с-с., у другую чаргу сялян да грамазадка-карыснай працы. Доўгі час сяляне вёсак Курганскага с-с. ламалі калёсы, ногі коням, лаяліся. Чакалі ўсё, што хтось та паправіць ім дарогі. Да школ адносіліся пасыўна...

У сучасны момант назіраецца зусім іншае... Самаабкладаньне разварушыла сялян. Значная частка сродкаў самаабкладаньня скарыстана на палепшэньне школьных будынкаў, так: усе сродкі ад самаабкладаньня вёскі Курганьня скарыстаны на школьныя будынкі, дзе іх да гэтага году ня было. У вёсцы Малашковічах на сродкі самаабкладаньня перанесен школьны будынак на школьны зямельны вучастак, зроблен капітальны рамонт школы. У вёсцы Асмоловічах у школе пакладзена новая падлога з дошчак. У вёсцы Каменка-Рыскоўская дабудоўваецца новая школа (па пляну).

Кіпіць праца на ўсіх прасёлкавых дарогах, дзе была нізіна, там абапал дарогі капаюцца канаўкі, робіцца грэбля, масткі.

Жартуюць сяляне на гэтых працах, ды самаабкладаньне хваляць:

— Вось гэта самаабкладаньне, вось яно падгоніць нас, заместа вуранёка, наладзіць дарогі.

Мацьвейчыкаў.

Бабруйшчына.

Праца пашыраецца.

(Ячэйка НКФ).

Зараз у ячэйцы ТДА-Авіяхіму лічыцца 116 чалавек, ахоплены амаль усе супрацоўнікі. Наогул трэба адзначыць, што праца пастаўлена добра і з кожным днём пашыраецца.

Праца ячэйкі ідзе па лініі гурткоў, у якіх супрацоўнікі вывучаюць вайсковую справу. У працягу зімы працаваў санітарны гурток, у якім займалася 20 супрацоўніц і каля 10 жонак служачых.

З вясны пачаў працаваць вайсковы гурток па 32-х гадзінай праграме, у гуртку займаецца 35 чал., а стала ў сярэдзіне даведваюць заняткі 27 чал. Гэты гурток таксама на днях скончыць сваю праграму і падагуліць вынікі.

Масавая праца пастаўлена ня зусім добра: з студзеня і да гэтага часу ўсяго было праведзена 2 лекцыі і адзін агульны сход членаў ТДА-Авіяхіму. У гэтай галіне наркамфінаўцам трэба падцягнуцца.

Вайсковы куток больш-менш абсталяваны добра, але ў дрэнным памяшканьні і з малай колькасьцю літаратуры.

16-17 ліпеня праводзіліся стралковыя спаборніцтвы на лепшага стралка; 2 супрацоўнікі за добрую стральбу атрымалі прызы.

19-20 ліпеня будзе праводзіцца вайсковая ігра па картах; гэта ігра выявіць усе вынікі зімовай працы.

Хто нас арганізуе?

Тыдзень абароны падыходзіць к канцу, а ў нас нічога ня зроблена і няма ніякай надзеі, што 250 чалавек сяброў саюзу савгандлеслужачых, якіх яднае групавы камітэт № 2, будуць арганізаваны ў дабраахвотнае таварыства ТДА-Авіяхім.

Паміж сяброў саюзу маецца да 70 проц. сяброў ТДА-Авіяхіму, а бюро ня складзена і няма ніякага кіраўніцтва, таксама не вядзецца ніякай працы паміж сяброў.

Няма гурткоў, ціру і хэмкаманд, а гэта дасягнуць ёсьць магчымасьць, бо маецца начпалітскад.

Сябры ня плацяць узносаў больш як па году, бо ня ведаюць куды плаціць. У чэрвені м-цы групавы камітэт арганізаваў ініцыятыўную групу, але апошняя нічога не зрабіла і па гэты час. Як відаць, ня было дадзена ініцыятыўнай групе—ініцыятывы.

Хто нас, 250 чалавек, арганізуе?

Дубавецкі.

Хроніка „Тыдню Абароны"

58 руб. у фонд абароны краіны.

Гэтымі днямі працкалектывы парыкмахераў г. Менску правялі «васкрэсьнік» у карысьць „Тыдню Абароны", ад якога было выручана 58 р. Сродкі пойдуць у фонд абароны краіны.

Арганізацыя ячэек ТДА-Авіяхіму.

У сувязі з кампаніяй „Тыдню Абароны" заўважваецца рост новых ячэек ТДА-Авіяхіму.

Так, за апошнія 2 тыдні арганізаваны новыя ячэйкі пры стройкоме № 9, групкоме № 4 і мясцкоме грузчыкаў Заходніх чыгунак.

Таксама заўважваецца ўступленьне ў шэрагі ТДА-Авіяхіму сезонных рабочых.

Бярэце прыклад.

Нядаўна адбыўся агульны сход рабочых заводу «Прафінтэрн» (Нова-Барысаў).

На сходзе было аднагалосна пастаноўлена адлічыць у фонд абароны краіны 2-хгадзінны заробак.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Бясчынствы ў чыгуначнай школе.

Гомель, 20-VII. Выпадкова выяўлена, што ў чыгуначнай школе былі шырока адчынены дзьверы для дзяцей папоў, спэкулянтаў і гандляроў. Плату за навучаньне школа брала з дзяцей рабочых і служачых.

Частка настаўніцтва супольна з адміністрацыяй школы праводзіла агідную працу па ўцягваньні ў школу дзяцей папоў, спэкулянтаў, „відных" людзей і г. д.

Вучні, пакінутыя школьным саветам на паўторны курс—адміністрацыяй пераводзіліся. Вучаніцу 9-ае групы Абруяну, якая мела па пяці прадметах нездавальняючыя веды, на калёквіуме падцягнулі і выдалі ёй пасьведчаньне аб скончэньні 9-цігодкі. А вучню-ж гэтае групы т. Родзько—сыну рабочага, які лічыўся ў школе самым разьвітым і актывістым, адмовілі ў выдачы гэтага пасьведчаньня.

Такіх прыкладаў шмат.

Непарадкі ў Скрыгалаўскай больніцы.

Мазыр. Даўно вядома Пятрыкоўскаму райённаму выканаўчаму камітэту, што ў Скрыгалаўскай больніцы справа абстаіць дрэнна. Туды выяжджаў і пракурор і інспэктар Аховы Здароўя. Першы прыяжджаў для расьсьледаваньня недарэчнасьцяў, якія там утварыліся, а другі—для ўрэгуляваньня ўзаемаадносін паміж мэдперсаналам і тэхнічнымі работнікамі.

Цяпер паглядзім, як стаіць справа ў больніцы пасьля ўсіх урэгуляваньняў.

Пшанічная мука, якой і для хворых атрымоўваецца недастаткова, расходуецца мэдперсаналам.

Мэдперсанал харчаваўся з катла хворых з разрахунку 25 кап. у дзень. Цікава, ці пракорміцца асоба мэдперсаналу за 25 кап. у сябе дома?

Кухарка больніцы зьяўляецца работнікам для мэдперсаналу, пячэ ім хлеб і інш.

Такія прывілеі маглі мець месца толькі ў Скрыгалаўскай больніцы.

Ю. Чайка.

Электрыфікацыя.

Ворша, 20-VII. Намечана поўная электрыфікацыя Задняпроўя, на што адпушчана ўжо 11 тысяч руб. Дача току за Дняпро павялічыць нагрузку гарадзкой электрастанцыі на 200 конскіх сіл. Дасьць магчымасьць поўнасьцю скарыстаць 300-сільны дызэль, што патаньніць каштоўнасьць электраэнэргіі.

Скончан рамонт усіх праводак па гораду.

С.

Электрыфікацыя м. Глуску.

Бабруйск, 20-7. Побач з агульным гаспадарчым упарадкаваньнем мястэчка Глуск складзен ужо каштарыс на яго электрыфікацыю. Правядзеньне электрыфікацыі будзе каштаваць 1970р. Ужо заключаны дагаворы на правядзеньне работ.

Вучот аб'ектаў абкладаньня.

Гомель, 20-7. У акрузе вучот аб'ектаў абкладаньня скончан па 210 сельсаветах. Выяўлена: пашы—360762 дзес., засеваў—248530, заліўное сенажаці—38119, не заліўное—147582, конай—106386 гал., валоў—12050, кароў—161808, сьвіней — 138132, авец—220136, неземляробчых заробкаў на 6 міліёнаў 628 тысяч руб.

Сродкі па самаабкладаньню не скарыстаны.

Пятрыкова. Скрыгалаўскі сельсавет правёў самаабкладаньне па суму ў 3136 руб. На 28-УІ паступіла 1410 р. альбо 37 проц. налічанай сумы, астатняя сума не спагнана.

На пратаколах агульных сходаў было вырашана сродкі гэтыя скарыстаць на рамонт больніцы і 2-х школ, але-ж да сяго часу нічога ня зроблена і будаўнічага матар'ялу для рамонту не загатоўлена.

Хто зацікавіцца, каб сродкі самаабкладаньня своечасова былі скарыстаны на рамонт.

Завод для варкі варэньня.

Бабруйск, 20-7. Сельска-гаспадарчая арцель «Арбэт» пачынае пабудову вялікага заводу для варкі варэньня. На пабудову яго будзе затрачана больш тысячы рублёў і выпрацоўваць ён будзе ў месяц 1500 пудоў варэньня.

Земляўпарадкаваньне.

Бабруйск, 20-7. За апошні год на Бабруйшчыне праведзена земляўпарадкаваньне сялянства на запасных фондах на плошчы ў 8570 гэкт. і па ўнутрывясковаму ўпарадкаваньню—на плошчы ў 17 тысяч гэктараў.

Падрыхтоўка да сяўбы.

ГОМЕЛЬ, 20-УП. Кантрольна-насенная станцыя Акрземаддзелу ў мэтах выяўленьня якасьці і гатунку насеньня, праводзіць грунтавы кантроль насеньня, заняўшы для гэтай мэты адзін гэктар плошчы ў савгасе «Пяскі» і частку цяпліцы ў парку імя Луначарскага.

Загатоўка сельска-гаспадарчае сыравіны.

Гомель, 20-7. За 10 дзён ліпеня месяца загатоўчымі органамі загатоўлена сельска-гаспадарчых прадуктаў на 35024 р. Паасобныя загатоўцамі загатоўлена: Палессельсаюзам—788 руб., Гомрайсаюзам—12493 руб., Дзяржгандлем—6353 р., іншымі загатоўцамі—9390 руб. Зернавых прадуктаў загатоўлена 8,3 тон.

Палепшыць якасьць цэглы.

ГОМЕЛЬ, 20-УІІ. Аддзел мясцовай прамысловасьці абсьледаваў якасьць цэглы. Выяўлена, што цэгла брылёўскіх заводаў рознай таўшчыні, ня мае стандартнага разьмеру. Цэгла рэчыцкіх заводаў маламерная, мае значны процант недапалу, да складаньня формаў адносяцца нядбайна і г. д. Усе гэтыя недахопы адбіваюцца на будаўніцтве. Адміністрацыі цагельняў прапанавана ўжыць меры да зьнішчэньня выяўленых дэфэктаў. Выпрацоўваемая цэгла павінна быць добраякаснай.

Барацьба з падзяжом хатняй жывёлы.

Гомель 20-УІІ. У мэтах найбольш паспяховага правядзеньня барацьбы з морам на хатнюю жывёлу, камісія акрвыканкому прычыніла неабходным скарыстаць адпушчаныя Белдзяржрэзервам сумы для пашырэньня ветэрынарнай сеткі. Адпушчаныя 7 тысяч рублёў на пабудову ветэрынарнага пункту ў Буда-Кашалёве, 2100 руб. на дабудову амбулятоўні ў Брагіне, 1925 руб. для скончэньня пабудовы ветэрынарнага пункту ў Койніках, 1100 руб. на абстляваньне ветэрынарнага пункту ў Агародні-Гомельскім і 872 руб. на рамонт ветэрынарных пунктаў у Дуброўках і Лоеве.

На процпажарныя мерапрыёмствы будзе выдадзена 4875 руб., прычым пажарны інвэнтар будзе ў першую чаргу накіраваны ў раёны найбольш небясьпечныя ў сэнсе пажараў.

Які сельсавет лепш рэалізаваў аблігацыі пазыкі.

Гомель, 20-7. Конкурсная камісія пры Акрфінаддзеле распачала выяўленьне сельсаветаў, якія лепш правялі кампанію па рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі. Папярэднія даныя паказалі, што Рудзянецкі сельсавет, Уваравіцкага раёну, Рудня-Нісімкавіцкі і Палескі сельсаветы, Чачэрскага раёну, Равенска-Слабодзкі, Чачэрскага раёну актыўна правялі кампанію і могуць удзельнічаць у конкурсе.

Новыя с.-г арцелі.

Барысаў, 20-УІІ. Сёлета арганізавана 7 новых с.-г. арцеляў і 7 перасяленцкіх арцеляў. Арганізавана адно машыннае т-ва, адна малочная арцель і 6 прамысловых арцеляў. У гэтым годзе Барысаўскі раён пабагацеў на 14 новых арцеляў і адно машыннае таварыства.

Да пабудовы прадзільна-ткацкага камбінату.

Ворша, 20-УІІ. Зараз у Воршы шырока разгорнута праца на падрыхтоўцы пабудовы ўрайёне Слабодкі прадзільна-ткацкага камбінату ВСНГ. Ужо абсьледаваны адзін вучастак. Зроблены буреньне і складзены пляны.

Пажар на швэйнай фабрыцы.

ГОМЕЛЬ, 20-УП. Учора раніцою на новабудуемай швэйнай фабрыцы ўзьнік пажар. У памяшканьні, дзе знаходзілася печка для награваньня жалезкаў, загарэлася бэлька. Пажар здарыўся з прычыны няправільнай устаноўкі дымаходу. У зьвязку з гэтым прыцягваецца да адказнасьці дырэктар фабрыкі і кіраўнік пабудовай.

Дапамога пагарэльцам.

ВОРША, 20-УІІ. Камісія ў складзе прадстаўніка РСІ, прадстаўніка АКРЗА і акруговага пракурора ўстанавіла, што пажар адбыўся ад падпалу, і арыштавала 3 кулакоў, якія падазраюцца ў падпале.

Пацярпеўшым адпушчана 700 пнёў лесу і 2000 руб. доўгатэрміновага крэдыту.

У хуткім часе будзе адпушчана дадаткова 3632 руб. крэдыту. РВК забясьпечвае пацярпеўшых хлебам да новага ўраджаю. Апроч таго, пагарэлым адпушчана 300 пуд. штучных угнаеньняў.

Страты ад навальніцы.

Ворша, 20-УІІ. Над Воршай праносілася [illegible] навальніца. Ад моцных гразавых разрадаў на центральнай тэлефонай станцыі пагарэла 135 прэдахранікцеляў. На кантрольна-вопытным тэлеграфна-тэлефонным пункце таксама згарэлі ўсе прэдахранікцелі. У абаненцтаў пагарэлі 3 тэлефонныя апараты; апошнія здарыліся з прычыны адсутнасьці прэдахранікцеляў, якіх няма ў 70 проц. абаненцтаў. Гэта трэба прыняць пад увагу беларускаму кіраўніцтву сувязі і прыняць належныя меры.

На тэлефоннай лініі Ворша-Дуброўна маленькай разьбітм 3 слупы, ад якіх шчэпкі ляцелі на некалькі дзесяткаў сажняў.

Мін. С.

Напад на пошту.

КОПЫСЬ, 20-VII. 16 ліпеня невядомымі злачынцамі зроблены напад на Копыськае аддзяленьне сувязі. Разламаўшы дзьверы, злачынцы ўлезьлі ў памяшканьне і забралі каля 1400 руб. грашмі і рознымі каштоўнасьцямі.

На гэтай справе вядзецца тэрміновае сьледзтва.

КУЛАЦКАЯ ПОМСТА.

Крупкі, 19-7. У в. Лавоўка-Ліванава праводзіцца земляўпарадкаваньне. Вёска мае 49 двароў. 33 двары атрымліваюць прырэзку зямлі. Арганізоўваецца таксама калектыўная гаспадарка. Кулакі на гэта навіралі скоса, пагражалі беднякам і каморнікам на сходах праз ананімныя пісулькі і г. д.

І, урэшце, ня вытрымалі і свае пагрозы пачалі правадзіць у жыцьцё. **10 ліпеня яны падпалілі калгасаўскія гаспадаркі. Перш з усіх бакоў яны падпалілі хату, дзе знаходзіліся на кватэры земляўпарадкавацелі, Бухман і Гуціна.**

У выніку згарэла 9 гаспадарак, 6 з іх калгасаўскіх. Выратаваць ад пажару нічога не ўдалося—пагарэла ўся дробная жывёла, хатняя маемасьць, с.-г. прылады і машыны. Страты ад пажару—12000 руб.

Прыняты самыя суровыя меры да адшуканьня і пакараньня злачынцаў-падпальшчыкаў.

Злачынцаў чакае жорсткая кара.

Герман Рэмэле.

Вурокі клясавай барацьбы.

У шэрагах буржуазеі эўрапейскіх капіталістычных краін пануе нэрвовы настрой. Буржуазны друк самых розных напрамкаў выяўлне настрой, які пануе ў шэрагах буржуазеі і робіць розныя вывады з факту росту камуністычнага ўплыву. У асноўным і галоўным вывады гэтыя прыводзяць да прызнаньня неабходнасьці ўзмоцненай барацьбы з міжнародным камунізмам. Вынікі выбараў у Польшчы, Францыі і Нямеччыне прымушаюць буржуазныя плыні прысьпешаным тэмпам стварыць адзіны фронт барацьбы з камунізмам.

Новае ўзбуджэньне ў шэрагах буржуазеі абумоўлена цэлым шэрагам зьявішчаў; іх нельга назваць інакш, як палітычнае хістаньне капіталістычнай стабілізацыі. Галоўным момантам служаць ня выбары: выбары—толькі асобны эпізод, які можа ў лепшым выпадку служыць паказальнікам ступені абвастрэньня крызісу капіталістычнага „аднаўленьня".

Агульны малюнак у прамысловых краінах Эўропы наступны: дробныя ізаляваныя стачкі, стачкі па асобных прадпрыёмствах і фабрыках выбухаюць усё радзей і радзей і на першы плян выступаюць стачкі, ахапляючыя цэлыя прафсаюзы і цэлыя галіны прамысловасьці (і магутныя масавыя стачкі ці нават усеагульныя стачкі). Буйныя масавыя стачкі ў Англіі, Нямеччыне, Чэха-Славакіі, Швэдыі, Нарвэгіі, а зараз нават і ў такіх краінах, дзе белы тэрор вэнішчыў прафрух, напрыклад, стачка гарнякоў у Румыніі, стачка тытунёўцаў і ўсеагульная стачка ў Грэцыі, і леташнія стачкі сел.-гасп. рабочых у Італіі—ясна сьведчаць аб вымене самага характару пралетарскай клясавай барацьбы ў перыяд пасьляваеннага імпэрыялізму.

Зьмена сутнасьці і асабісты характар клясавай барацьбы ў пасьляваенную эпоху абумоўлены асаблівасьцямі імпэрыялістычнага разьвіцьця капіталізму ў пасьляваенную эпоху. Імкненьне выратаваць капіталістычны лад, шуканьне выхаду з бязладзьдзя вайны, з банкрутства ў эпоху інфляцыі і дэфляцыі, рацыяналізацыі і поўная ператасоўка матар'яльнай падставы капіталістычнай гаспадаркі знаходзяць свой адбітак у грамадзка-арганізацыйных формах, культывуемых ў інтарэсах выратаваньня капіталізму і прымушаючых шукаць новыя формы клясавай барацьбы. Да ліку гэткіх шляхоў належыць арбітраж у пытаньнях зарплаты і рабочага часу. Супроць права кааліцыі і стачак ужываюцца законадаўчыя і адміністрацыйныя меры, клясавая юстыцыя і дзяржаўна-адміністрацыйныя органы,—увесь апарат паліцыі і арміі дапамагае клясавай барацьбе буржуазеі з пралетарыятам. У краінах тэрору гэта дасягаецца фашысцкімі «незаконнымі» сродкамі—адміністрацыйным і паліцэйскім уплывам, у так званых «дэмакратычных» краінах таксама настойліва праводзіцца ў жыцьцё заканадаўчым парадкам, які дае поўны напрамак чынасьці адміністрацыйных і судовых органаў. У Англіі, у Нямеччыне, а зараз і ў Скандынаўскіх і іншых краінах,—усюды вельмі стараюцца перанесьці вырашэньне пытаньня аб зарплаце і рабочым часе са стачачных сходаў у залю судовых пасяджэньняў і гэты факт нямала дапамагае рэвалюцыянізаваньню рабочых мас.

Усе выбары, якія адбываліся пасьля 1926 году, адзначаны цэлым шэрагам характэрных рысаў, галоўныя з якіх наступныя: 1) адзіным згуртаваным клясавым фронтам усіх буржуазных партый супроць камуністычнай партыі; 2) выступленьне рэфармізму ў якасьці авангарду ў лютай барацьбе з камунізмам; 3) у лягеры буржуазеі, сярод буржуазных партый і паміж розныміі групоўкамі капіталістаў адбыўся аўны працэс нівеліроўкі, прычым запанавалі інтарэсы трэставага капіталу, вострая варожыя інтарэсам пралетарыяту і 4) пры ўсіх парляманцкіх выбарах адным з аблюбаваных сродкаў барацьбы з пралетарыятам зьяўляецца выкарыстаньне апарату дзяржаўнага прымусу ў выбарчай барацьбе з камуністычным рухам для ўнясеньня «карэктыў» у вынікі выбараў.

Парляманцкія выбары ў капіталістычных краінах не зьяўляюцца, зразумела, правільным адбіткам суадносін сіл варожых між сабой клясаў. Прымусовы апарат і сродкі дзяржаўнай і грамадзкай прапаганды—у руках капіталізму, а таму вынікі выбараў могуць быць толькі жывым адбіткам існуючых суадносін грамадзкіх сіл. Ня гледзячы на ўсё гэта, вынікі выбараў у апошнія два гады служаць яскравым паказальнікам абвастрэньня клясавых супярэчнасьцяй і зьмены характару клясавай барацьбы.

Вынікі выбараў па паасобных краінах нельга расцэньваць на падставе простага параўнаньня лічбовых даных. Розьніца ў умовах і абставінах выбараў у розных краінах робіць немагчымым параўнаньне вынікаў выбараў; але тэндэнцыя разьвіцьця клясавых сіл усё яшчэ да некаторай ступені выяўляецца. З гэтаю агаворкаю мы прыводзім даныя выбараў:

У Польшчы ў 1922 г., г. зн. 6 гадоў таму назад, за камуністаў было пададзена ўсяго 128.000 галасоў. У гэтым жа годзе камуністы аб'яднаді навакол сваіх сьпісаў 830.000 галасоў. Такім чынам, прырост складае 702.000 галасоў, іншымі словамі, 550 проц. У цэлым шэрагу буйных рабочых цэнтраў сацыял-дэмакраты былі разьбіты кампартыяй.

Усьлед за выбарамі ў Польшчы адбываліся ў красавіку выбары ў Францыі. Францыская кампартыя атрымала пры першай балётыроўцы 1.100.000 галасоў супроць 875.000 галасоў у 1924 годзе. Такім чынам, прырост галасоў складае 225.000, ці 25 проц. У 70 дэпартамэнтах францыская кампартыя выйграла галасы, а ў 16 дэпартамэнтах страціла. Балянс выйгрышаў і страта ясна сьведчыць аб тым, што францыская кампартыя ўдалося набіць сацыялістаў, абаронцаў, якія групаваліся навакол Бонкура ў галоўных прамысловых раёнах і выціснуць іх уплыў на вёсцы.

Выбарчым посьпехам у Польшчы і Францыі ня суступаюць выбарчыя посьпехі камуністаў на парляманцкіх выбарах у Нямеччыне. У Нямеччыне ў камуністаў у сьнежні 1924 г. было 2.709.000 галасоў, а на выбарах 20-га мая гэтага году 3.233.000. Такім чынам, прырост галасоў складае ў іх 524.000, ці 20,6 проц.

Выбары ў капіталістычных краінах усюды выявілі вострае палярызаваньне шырокае масы выбаршчыкаў; у прыватнасьці, шырокія рабочыя масы перакачавалі з лягеру сацыял-дэмакратыі ў лягер камуністычных партый.

Вялізны рост галасоў у камуністычных партый у капіталістычных краінах у зьвязку з агульным характарам, эканамічнымі і палітычнымі цяжкасьцямі, якія паўстаюць перад буржуазеяй, прымушае яе ўзмоцнена прасьледаваць камуністаў. Ня толькі буржуазея і буржуазны дзяржаўны апарат, але і сацыял-дэмакратычныя партыі—II Інтэрнацыянал, Амстэрдамскі Інтэрнацыянал і іншыя меншавіцкія арганізацыі,—востра зьмяняюць курс у адносінах рэвалюцыйнага клясавага руху пралетарыяту. Рост клясавых супярэчнасьцяй, новы рост актыўнасьці ў шэрагах пралетарыяту ўсіх краін, масавы характар эканамічнае барацьбы, усё, што награжае патрасеньнем асноў буржуазнае дзяржаўнае ўлады, усё гэта штурхае сацыял-дэмакратаў на шлях абароны існуючага дзяржаўнага, грамадзкага і капіталістычнага ладу, наперакор інтарэсам пралетарыяту. Гэтым тлумачыцца завастрэньне II Інтэрнацыяналам барацьбы ва ўсіх капіталістычных краінах і ўжыцьцё ўсё больш і больш суровых мер супроць кампартыі. Узмоцненая барацьба сацыял-дэмакратаў з рэвалюцыйным рухам знаходзіць свой адбітак у масавых выключэньнях камуністаў з рэфармісцкіх прафсаюзаў, у расколах прафсаюзаў—у Швэйцарыі, Грэцыі і Шатляндыі,—у пагрозе Генэральнага Савету ангельскіх трэд-юніёнаў выключэньнем з усіх арганізацый.

Усе гэтыя фактары міжнароднага рабочага руху сьведчаць аб тым, што мы каля парогу новае міжнароднае арыентыроўк

РЭЗАЛЮЦЫІ ПЛЕНУМУ ЦКК КП(б)Б:

I. ПА ДАКЛАДУ „АБ ВЫНІКАХ МАСАВАЙ ПРАВЕРКІ ФАКТЫЧНАГА СКАРАЧ. АДМ.-ГАСП. ВЫДАТКАЎ ЗА 1-е ПАЎГОДЗЬДЗЕ 1927-28 г.“

1. Пленум ЦКК адзначае, што ажыццяўленьне намечанага, у выніку распрацоўкі і зацверджаньня каштарысу на 27-28 г. па ўсіх вяленьях кіраўніцтва і гаспадаркі, скарачэньня адм.-гасп. выдаткаў, якія навінны даць да 8 міл. эканоміі на задаволеньне патрэб прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, ЗНАХОДЗЯЦЦА ПАД ПАГРОЗАЮ ЗРЫВУ Ў СІЛУ АДСУТНАСЬЦІ КАШТАРЫСНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ. Праведзеная сіламі РСІ і прафсаюзаў (эканам. і вытворч. камісіі) праверка фактычных выдаткаў бягучага гаспадарчага году выкрыла шэраг буйных парушэньняў каштарыснай дысцыпліны, наліччa шэрагу фактаў бюракратычнага абыходу дырэктывы партыі і ўраду аб 20 проц., нерацыянальнага і неэкамомнага выдатканьня сродкаў, на толькі далёка няпоўнае ажыццяўленьне 20 проц. скарачэньня па шэрагу ўстаноў прадпрыёмстваў, але і поўны зрыў зацверджаных каштарысаў, асабліва ў прамысловасьці па заводзкім выдатках, чаткова каапэрацыі, асабліва сельска-гаспадарчай, па транспарту і інш. арганізацыях, штучнае павялічэньне адмін. выдаткаў на дзяржаўнаму і мясцоваму бюджэту за кошт незабюджэтных сродкаў.

2. Пленум ЦКК адзначае, што прызыў партыі к рабочым і служачым «узяць на сябе праз прафсаюзныя арганізацыі непасрэдны кантроль над фактычным правядзеньнем 20 проц. скарачэньня“ знайшоў мысы водгук у шэрагу арганізацыяў, узмацніў грамадзкую ўвагу да справы выніканьня клеытворчых выдаткаў, стварыў значны рух у рабоце шэрагу эканам. і вытворчых камісіяў, падвысіў непасрэдны іх удзел і садзейнічаньне гаспадарнінам у разьвязваньні гэтай задачы. Адзначаючы наліччa шэрагу прыкладаў правільнай пастаноўкі грамадзкага кантролю праз нізавыя прафорганы (ячэйка Харчтрасту, ВСНГ, БКС, НКФ, вытворч. камісіі. драмдамовага заводу „Зара“, пінаварнягa «Пралетары» і інш.), Пленум канстатуе, што значная частка арганізацыяў падышла да пытаньня фармальна, не праявіўшы павіннай увагі і настойлівасьці ў намячэньні канкрэтных шляхоў да зьніжэньня накладных выдаткаў, а раўно да ажыццяўленьня ўхіляемых рашэньняў, часта па віне кіраўніцкай установы і прадпрыёмстваў і часта з-за адсутнічаньня павіннага кіраваньня і практычнай дапамогі з боку значнай частні РК, парт. ячэек і прафарганізацыяў (акруговыя адхіленьні і ЦП пасобных саюзаў). Асобна неабходна адзначыць недастатковую інфармацыю мас (рабочых сходаў) аб прымаемых намісіямі рашэньнях і слабасьці ініцыятывы па рацыяналізацыі апарату. Адзначыць працу, праробленую саюзам савгандальслужачых. Адсутнасьць узгодненасьці ў кіраваньні работай па зьніж. выдаткаў між ВСНГ і ЦСПС.

Адзначыць невыкананьне Дзяржфінанпрозем узятых на сябе абавязкаў аб праверцы сваімі сіламі 50 проц. устаноў, якія знаходзяцца на дзяржаўна-мясцовым бюджэце, а таксама адсутнасьць грамадзкасьці і сувязі з грамадзкімі арганізацыямі пры правядзеньні праверкі ў частцы Ўстаноў.

3. У мэтах поўнага ажыццяўленьня дырэктывы аб 20 проц., таксама забесьпячэньня поўнай каштарыснай дысцыпліны Пленум ЦКК прапануе:

а) Прэзыдыуму ЦКК і ўсім акр. НК-РСІ найбольш поўна выявіць усе выпадкі грубага парушэньня каштарыснай дысцыпліны і вінаватых кіраўнікоў установ і прадпрыёмстваў прыцягнуць да адказнасьці.

б) Абавязаць усіх кіраўнікоў установ і прадпрыёмстваў дакладна прытрымлівацца зацверджаных каштарысаў, і дапусьціўшым перавыдатак у 1-м паўгодзьдзі шляхам жорсткай эканоміі ў 2-гім паўгодзьдзі ўкласьціся ў каштарыс. Пленум папярэджвае, што парушэньне каштарысаў і бюракратычныя абыходы дырэктывы партыі будуць разглядацца, як растрата дзяржаўных сродкаў.

в) Улічваючы, што вялікім тормазам у час праверкі фактычнага выкананьня каштарысаў за 1-е паўгодзьдзе зьяўлялася незнаёмства і няўдзел прафорганаў у іх складаньні, прыступіць да падрыхтоўкі каштарысу на 1929 г. пры шырокім удзеле грамадзкіх арганізацыяў і рабочых мас, устаканіўшы як правіла, што вышэйстаячыя арганізацыі ня могуць прыняць да зацверджаньня каштарысы без папярэдняй праверкі гэткай вытворчымі і эканам. камісіямі і агульнага сходу рабочых і служачых.

г) Усім АКК-РСІ ўлічыць вопыт першай шырокай арганізацыі масавага кантролю за ходам выкананьня каштарысаў для правільнай арганізацыі другой праверкі па скарачэньню гаспадарчага году, усклаўшы адказнасьць, паміма кіраўніка ўстановы, і на кіраўнікоў рахункавага апарату за своечасовае і дакладнае падвядзеньне балансаў за бягучы год з такім разьлікам, каб не пазьней 1-15 сьнежня можна было-б сіламі грамадзкіх арганізацыяў праверыць фактычнае ажыццяўленьне дырэктывы аб 20 проц. за 1927-28 г.

4. Пленум ЦКК прапануе ўсім партарганізацыям няўхільна сачыць за поўным ажыццяўленьнем дырэктывы партыі і ўкады аб скарачэньні выдаткаў, узмацніўшы кіраўніцтва арганізацыяй масавага кантролю грамадзкіх арганізацыяў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на сапраўднае кіраўніцтва з боку прафсаюзаў гэтай работай і аказаньня нізавым ячэйкам практычнай дапамогі ў справе вывучэньня і камячэньня канкрэтных шляхоў да скарачэньня накладных выдаткаў.

5. Пленум ЦКК КП(б)Б ашчэ раз напамінае ўсім кіраўніком установ і прадпрыёмстваў, што 20 проц. скарачэньне выдаткаў павінна быць замацавана работай па рацыяналізацыі апарату, што без такой работы, праведзімай імі разам з прафсаюзнымі арганізацыямі (фабкомы, мясцкомы, вытв. і эканом. камісіі) на можа быць у поўнай меры забясьпечана дасягненьне прымечанай партыяй і ўрадам максымальнай эканоміі дзяржаўных сродкаў. У прыватнасьці, неабходна поўнае ажыццяўленьне закону аб пашырэньні правоў прадпрыёмстваў і ўзмацненьне адказнасьці рахункавага апарату за правільнае вядзеньне рахункаводства і своечасовае прадстаўленьне балансаў (мясцовая і дзяржаўная прамысловасьць), асабліва ўвага стварэньню простага, танага і ёмкага вучоту і справаздачнасьці.

6. Адзначаючы значную працу, праробленую друкам у гэтай справе, Пленум прапануе органам друку, у прыватнасьці, насьценгазэтам, шырэй скарыстаць выніні праверкі для суровай крытыкі ўсіх тых, хто так або інакш бюракратычна абыходзіць выкананьне дырэктыў па скарачэньні навытворчых выдаткаў.

II. ПА ДАКЛАДУ БЮРО СКАРГАЎ НКРСІ БССР.

1. Лічыць, што на падставе дырэктыў II пленуму ЦКК КП(б)Б ад 3-III г. г. па пытаньню аб барацьбе з бюракратызмам і валакітай, у працы Бюро Скаргаў маюцца наступныя дасягненьні:

а) праведзены сходы на рабочых прадпрыёмствах, дзе былі пастаўлены справаздачы Бюро Скаргаў, абраны рабочыя засядацелі для ўдзелу ў працы Бюро Скаргаў;

б) уцягнут у працу актыў ад намасанольскіх ячэек, прафорганаў, рэв. намісіяў, рабкораў, ад гарсавету, а таксама член. ЦКК і партасядацелі;

в) праведзена 48 пасяджэньняў з удзелам рабочых засядацеляў, на якіх разгледжаны 354 справы (з іх на прадпрыёмствах было 9 пасяджэньняў);

г) палепшана праца па прыёму наведвакеляў, якія асабіста зварочваюцца ў Бюро Скаргаў па рознастайным пытаньням, шляхам своечасовага рэагаваньня праз адведныя ўстановы;

д) палепшана сувязь з Пракуратурай і рэдакцыямі газэт, што дало магчымасьць у большай частцы зьнішчыць існуючы пралелізм памiж працай Бюро Скаргаў Пракуратурай і рэдакцыяй, у выніку чаго тэрмін праходжаньня скаргаў значна скарацілся.

2. Побач з гэтым адзначыць недахопы:

а) недастатковае асьвятленьне ў друку дзейнасьці яе ЦБС., таксама і апруговых і недастатковае вывучэньне і абагуленьне паступаючага матар'ялу ў Бюро Скаргаў;

б) недастатковае рэагаваньне некаторых устакоў на запытаньне Бюро Скаргаў і фармальныя адпіскі, тэрмін праходжаньня скаргаў, зьвязаных з высьвятленьнем праз іншыя ўстановы зяўляецца вялікім;

в) недастатковая праца па арганізацыі кіраўніцтва *выдатковымі ў працу* Б. С. рабочых—членаў саюзу, слабое разгортваньне адчыненых пасяджэньняў па разгляду скаргаў на прадпрыёмствах.

3. У далейшай рабоце прапанаваць Бюро Скаргаў НКРСІ, а таксама і Акр. Бюро Скаргаў:

а) дабіцца найнарацейшага тэрміну праходжаньня скаргаў, прыцягваючы да адказнасьці асоб за своечасовасьць адказ на запытаньне Бюро Скаргаў;

б) узмацніць кіраваньне рабочымі засядацелямі, дабраахвотнікамі і актывам, больш уцягваючы іх у практычную працу па высьвятленьні паступаючых скаргаў;

в) дабіцца дэталёвага вывучэньня і абагуленьня паступаючага матар'ялу ў Бюро Скаргаў для мэты праправоўні практычных вываў;

г) шырэй асьвятляць дзейнасьць Бюро Скаргаў у друку шляхам зьмяшчэньня ў мясцовых газэтах пастаноў Бюро Скаргаў і выніку расьсьледваньня па паступаючых скаргах;

д) практыкаваць і далей разгляд характэрных скаргаў на прадпрыёмствах і сялянскіх сходах, а таксама перыядычна рабіць справаздачы аб рабоце Б. С. перад рабочымі і сялянскімі масамі і ў першую чаргу ў тых мясцовасьцях, адкуль найбольш паступае скаргаў.

4. Даручыць Прэзыдыуму ЦКК распрацаваць мерапрыёмствы па палепшаньні прыёму наведвацеляў у ўстановах і на прадпрыёмствах, таксама па атрыманьні неабходных справак.

Праверка—самакрытыка—кантроль мас.

Для каго Жакты?

Фармалізм, пратэкцыянізм, цеганіна, безгаспадарчасьць, напляваўцельсвія адносіны да выпаўненьня абавязкаў і бюракратызм пануюць ва ўсю ў праўленьні Бабруйскага жакту імя Карла Лібкнэхта. Асобы з «палажэньнем», маючыя 3-4 душы сям'і, займаюць кватэры з жылой плошчай больш 60 кв. мэтраў у той час, як масавыя сябры т-ва, маючыя па 6 і больш душ сям'і, тлумяцца ў цесных кватэрах на 20-30 кв. мэтрах. Заявы апошніх аб пашырэньні жылой плошчы іх кватэр за кошт кватэр першых праўленьне пакідае без здавальненьня. Рамонт кватэр, які меркаваўся два гады таму назад, да гэтага часу не праведзены за «адсутнасьцю сродкаў», а між тым гэтыя самыя сродкі затрачваюцца на закупку матар'ялу для пабудовы пры несадрамантаваных кватэрах хлявоў, у якіх асобнай патрэбы няма. Матар'ял гніе на дварэ пад адкрытым небам усю восень, зіму і вясну і, нарэшце, праўленьне ізноў тыі знаходзіць сродкі на пабудову гэтых хлявоў. У той час, калі будуюцца хлявы, сябры т-ва задыхаюцца ад пылу ў цесных памяшканьнях, з несадрамантаваных сьцен, якіх нават пры хадзьбе на падлозе сыпецца тынкаваньне.

Кватэрная камісія, як быццам, акуратна выконвае свае абавязкі—наведвае кватэры, агляда іх, выяўляе недахопы, робіць свае заўвагі, але карысьці ад гэтага найніякая мала, бо праўленьне ня вельмі кідаецца выконваць прапановы камісіі.

Сябром т-ва і прадстаўніком іх саюзаў ёсьць поўная магчымасьць пазнаёміцца з тэй цеганінай, з прычыны якой прыходзіцца на 7-8 разоў хадзіць у праўленьне, каб хоць раз напасьці на яго пасяджэньне. Вельмі цяжка праўленьню сабраць кворум!

Старшыня праўленьня т. Еранбург—асоба са стажам (працуе ў т-ве, здаецца, другі год), трымае сябе, як быўшы «валасны старшыня», а ня як прадстаўнік пралетарыяту. Адносіны яго да сяброў т-ва і нават да прадстаўнікоў прафарганізацый надзвычайна грубыя і неўважлівыя. Членаў свайго праўленьня ён трымае „пад свой цьвік“. Масавы сябра таварыства ў яго ніяк ня можа атрымаць добрай кватэры, бо ў яго заўсёды ў запасе знаходзяцца свае «лепшыя» кандыдаты.

Ці не пара кантралюючым органам пацікавіцца, што робіцца ў гэтым жакце? Ці не пара і т. Еранбурга паставіць на належнае месца?!

Пайнік.

Буйныя „дробязі“.

Загадчык ларком № 4 МЦРК мае свае павадкі, ён чалавек асобнай натуры: для яго законных дырэктыў праўленьня МЦРК ня існуе, і калі да яго прыйшла адна грамадзянка з разьліковай кніжкай прасіць хлеб, ён злаўсьліва паглядзеў на яе, няўважліва кінуў ёй у твар кніжку і горда прамовіў:

— Для вас хлеба няма.

— Чаму, дарагі таварыш?

— Ды таму, што ў кніжцы не адзначана: «не найшчык».

Старая, змучаная чаргой грамадзянка заплакала:

— Але-ж тут ёсьць адзнака мясцкому,—я лічу, што гэтага хопіць.

— Ніякіх мясцкомаў я не прызнаю, мне патрэбны надніс: „не найшчык“.

І калі гэтая грамадзянка пачала маліць і ўпрашваць даць ёй хоць кілё хлеба, загадчык ларком ня толькі ня зьлітаваўся, а яшчэ аблаяў яе.

* * *

Які цяпер народ нервовы, напрыклады і злы; асабліва гэта адчуваецца, калі прыходзіш у сталоўку МЦРК, што на рагу Савецкай і Энгельса вул. О, там нельга прасіць даць паабедаць. Там, хоць лопні, а трымай фасон: сядзі важна і чакай, пакуль пададуць праз паўтары гадзіны.

— Ну, дайце-ж, нарэшце, што-небудзь паесьці,—папрасіў адзін з чакаючых.

— Няма часу, пачакайце, не гарыць, бачыце, заняты, не марочце галавы! Вы ўсім несьвядомы. Адным словам, на вашу просьбу так „красамоўна“ адкажуць, што вы страціце жаданьне есьці і накіроўваеце ся дамоў не абедаўшы.

Чытач! Не зайздрошчу, калі табе па якіх-небудзь прычынах прыходзіцца абедаць у вышэйпамянёнай сталоўцы: насядзішся, колькі ўлезе, а ў лепшым выпадку—табе вернуць назад грошы.

Стрэлачнік.

А можа і дапаможа.

Сустраў мяне надоечы дзядзька Ліпскі, якога я ведаю даўно, ды і кажа:

— Парайце мне, дзіцятка, што далей рабіць.

А што?

— Быў я ў Менску, аж у самага Масальскага, казаў яму пра сваю справу.

— А ў чым твая справа?

— А вы ня чулі?

— Не.

— Ну, дык слухайце: служыў я ў Дзедлаве, па вінзаводзе старшым рахункаводам. Ня ведаю калі, а толькі пачаліся там п'янкі паміж служачымі пад кіраўніцтвам самога загадчыка. Сьпірытус кралі з заводу і разбаўлялі па густу вадой. Ну, вядома, пілі сьмела, бо спадзяваліся, што ўсё сойдзе, бо праваднір партыйны. Яж, як вам вядома, ад нараджэньня гарэлкі ня п'ю і таксама тытюню ня ўжываю і таму ніякага ўдзелу ў іх п'янках і гульбішчах ня прымаў. Ці то даведаліся пра гэта тыя, каму належыць, ці то западозрылі мяне ў датычнасьці да гэтага, а толькі пачалі да мяне чапляцца: спачатку зьвялі ў малодшыя рахункаводы, а потым і зусім «скарацілі», нібы таму, што хадзіў у царкву.

— Што хадзіў ты ў царкву, дык гэта табе яшчэ можна дараваць—адказалі мне ў Менску,—а вось што ты не паведаміў каго належыць аб гэтых п'янках і крадзяжу сьпірытусу, дык гэта табе трэба паставіць у віну.

— Друку скардзіліся?

— А як жа. Шмат разоў пісалі ў «Зьвязду», толькі «нічаво ня действат». Вось цяпер склаў зноў скаргі ў „Зьвязду“, пракурору, і ў РСІ і нясу на пошту.

А можа і дапаможа. **Я. С.**

Няпісьменнасьць сярод пісьменных.

У Рагачэве абвесткі каапэрацыйных і адміністрацыйных органаў друкуюцца ў большасьці на расейскай мове. Ёсьць абвесткі і на беларускай мове, толькі па гэтых абвестках відаць, што адказныя працаўнікі в райвыканкому ня ведаюць беларускай мовы. Вось, напрыклад, друкаваная абвестка райвыканкому за подпісам загадчыка зямельнай часткі і інш. і з адпаведным нумарам райліту.

„8-га ліпеня у г. Рагачэве будзя арганізавана і праведзена раённая выстаўка жывёлаводства, птушкаводзцва і малочнай гаспадаркі. Арганізуемая выстаўка мая мэту наглядна высьвятліць... апредзеліць якасна састаў... правядзеньня гэтай намечанай мэты...“.

Альбо вось лёзунг у «Тыдзень абароны»—

„Няхай памятуюць усі нашы ворагі ваенны напад супроць СССР ператворім у рэвалюцыйную вайну за зьвяржэньне улады капіталу у ваусім сьвеце“ (Рограйліт 188).

Паміж іншым, на кожнай абвестцы стаіць адпаведны нумар рагачоўскага райліту. Чаму дасецца дазвол на друкаваньне такіх няпісьменных абвестак.

Таварышы в Рагачэўскага РВК, калі ў вас, нарэшце, «будзя арганізавана і праведзена» праверка беларусізацыі і, калі акруговая нацкамісія «мая на мэце наглядна высьвятліць і апредзеліць» прычыны беларускай няпісьменнасьці вашай установы?

Цікава толькі, якую карысьць прынесьлі каштарысныя сродкі на беларусізацыю.

Б. Н.

Скарацілі аднаго, а прынялі другога.

У Талочынскім РВК Аршанскай акругі скарацілі працаўніка ЗАГС, у т. Дамброўскага, а на яго месца прынялі нячлена саюзу, жонку фінінспэктара Турцэвіча.

Дамброўскі ніякай уласнасьці ня мае і зарабляў сабе на жыцьцё, а муж Турцэвіч атрымлівае 75 руб. і яшчэ яна працуе.

Чалавека, які павінен загінуць з голаду, ды яшчэ члена саюзу, зьнялі чамусьці з працы пад выглядам «скарачэньня», а пасадзілі таго, каму трэба зарабляць на дарагія сукенкі і пудру.

Праўда, Турцэвіч зрабілі і машыністкай, каб пасьля можна было сказаць, што мы скарацілі штат, бо, што вынялі аднаго, а прынялі па пратэкцыі жонку фінінспэктара, гэта мы ведаем. На ведае пра гэта толькі саюз савгандальслужачых, як пад выглядам скарачэньня прымаюць нячлена саюзу.

Калі гэтае скарачэньне ўжо зроблена, дык няўжо ніхто в працаўнікоў ня можа замяніць машыністку і чаму гэта скарацілі іменна т. Дамброўскага, з працай якога заўрад ці справіцца „машыністка“.

Хаім Зак.

ВЫЙДЗІ ВОН, А ТО АБЛІЮ ВАДОЙ.

7 ліпеня ў Ракаедаўскую малочную арцель, Рубілкаўскага сельсавету (Самахвалавіцкага раёну) зайшло двое сялян з другога сельсавету, якія таксама лічацца пайшчыкамі, але толькі другое арцелі. Гэтыя сяляне прышлі з намерам распытацца аб становішчы Ракаедаўскай арцелі і параўнаць яе са сваёй. На запытаньні, колькі вырабляецца масла, куды яго збываюць, якая пэнсія выплачваецца працаўнікам, колькі паступае штодзённа малака, масларобаў адказваў падрабязна і з ахвотаю.

На гэту гутарку ўвайшоў старшыня праўленьня Матусэвіч Сьцяпан. Яму, мусіць, не падабаўся надворны выгляд сялян і ён нервовым голасам закрычаў:

— Што вам тут трэба! што вы, развізія якая, ці што? Прэч з заводу і не перашкаджайце працаваць.

Сяляне зазначалі, што яны зусім ня перашкаджаюць працы заводу, што яны прышлі з мэтаю пацікавіцца працаю арцелі.

Калі старшыня пачуў гэта, дык схапіў зядро з вадою і закрычаў:

«Выйдзі вон, а то аблію вадой».

Рабочыя, як «вінаватыя», вышлі за перапалоханымі сялянамі, а старшыня зачыніў завод на замок.

Вось вам і растлумачаны мэты арганізацыі арцеляў.

Прысутны.

Індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі.

Дзяржплян зацьвердзіў выдаткі на правядзеньне індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі на бліжэйшыя 5 год. У працягу гэтай пяцігодкі ў БССР мае быць пабудована цэлая сетка фабрык і заводаў і цэлы шэраг падсобных пунктаў па перапрацоўцы прадуктаў сельскай гаспадаркі: заводы па перапрацоўцы малочных прадуктаў, бульбы, валакна, садавіны, кармова-падрыхтоўчыя пункты, рыбы, бэконныя камбінаты, некалькі халадзільнікаў, адкормачныя пункты для птаства і інш. На ўсе гэтыя мерапрыёмствы па пляну вызначана 22.488 тысяч руб. Будаўніцтва будзе праводзіцца па лініі савгасаў, калгасаў, каапэрацыі і ўправы дзяржаўнага гандлю. Апошняя будзе праводзіць будаўніцтва мясного камбінату ў Воршы, халадзільнікаў Гомелі, цэлага шэрагу рэзьніц, бэконных фабрык у Гомелі і Менску, птушка-яечнага камбінату в птушка-маразілкай, на што асыгнуецца 4800 тысяч руб.

Першае месца ў гэтай галіне займае будаўніцтва малочнай прамысловасьці (4.657 тысяч руб., а ў 1928-29 г.—925 тысяч руб.). Сёлета з восені мяркуецца распачаць будаўніцтва буйнага малочнага заводу для вырабу экспартнага масла, бо да гэтага часу мы яшчэ такіх заводаў ня маем, а таксама цэлыя сеткі масляна-сыраварых заводаў сярэднага тыпу.

У сувязі з разьвіцьцём малочнага ўхілу ў с. г. перад намі паўстае дылема аб паляпшэньні кармовых рэсурсаў. Адным з такіх мерапрыёмстваў зьяўляецца арганізацыя пунктаў па сіласаваньню зялёных кармовых адкідаў і ўстаноўцы машын па перапрацоўцы грубых кармоў (саломы, сена), спажыўнасьці якіх ня могуць поўнасьцю ўсмактавацца арганізмам жывёлы,—у вотрубі, якія пры падмешцы в бульбяными патачнымі і інш. адкідамі могуць даць вельмі танны і спажыўны корм для малочнай жывёлы.

Значнае месца павінна заняць перапрацоўка бульбы па лініі толькі каапэрацыі і калгасаў. З аднаго боку, будзе атрымоўвацца таварны крахмал, з другога боку, яны будуць мець патрэбныя для кармежкі скаціны бульбяныя адкіды.

Зусім новая галіна ў сельскай гаспадарцы зьяўляецца выкарыстаньне птушыных прадуктаў. У Полацкай, Мазырскай і Бабруйскай акругах мяркуецца арганізацыя адкормачных пунктаў гусей, дзе разьвядзеньне якіх больш усяго пашырана.

Да гэтага часу з Беларусі вывозілася на замежныя рынкі пераважна жывыя гусі, ад чаго матар'яльны эфект быў значна меншы. Нам тым болей важна разьвіцьцё гэтай прамысловасьці, бо БССР знаходзіцца на самай мяжы з замежнымі рынкамі і ў нас маюцца спрыяючыя ўмовы для разьвядзеньня рознага птаства. У 1928-29 г. у Жлобіне будзе пабудован камбінат з халадзільнікам, адкормачным пунктам, а затым будуць арганізаваны адкормачныя пункты ў Менску, Гомелі.

Пяцігадовым плянам прадугледжваецца буйны рост мэханічнай апрацоўкі ільнянага валакна. Кожны год будзе будавацца адзін буйны завод па перапрацоўцы ўсёй ільнянай саломы ў райёне яго дзейнасьці. Апроч гэтага будуць арганізоўвацца пункты па мочцы лёну і пункты мэханічнай апрацоўкі ільнянай саломы ў тых райёнах, дзе сырнавая база недастатковая для пабудовы буйнага заводу.

Рыбная гаспадарка з кожным годам павялічваецца, з кожным годам расьце здобыч яе. У сувязі з гэтым высунута патрэба ў пабудове спэцыяльнага солачна-вэндлярнага пункту.

Урад БССР надае вялікае значэньне бэканізацыі. На будаўніцтва бэконнай фабрыкі з камбінатам у Воршы, якое ўжо распачалося, асыгнавана 1.750 тысяч руб. Камбінат мае быць закончан да 1-га кастрычніка 1929 г. з гадавой прадукцыяй у 75 тысяч галоў. У сувязі з тым, што ў Гомелі мае быць пабудован халадзільнік, а ў Менску ён ужо ёсьць, з абодвых гэтых пунктаў па пляну вызначана пабудова бэконных фабрык.

І, урэшце, трэба спыніцца на тым, якую ролю павінна адыграць разьвіцьцё фрукта-апрацоўчай прамысловасьці, якая пакуль што знаходзіцца ў пачатачным стане. Пад канец пяцігодкі ў нас будзе цэлая сетка фруктова-вінна-сушыльных заводаў, якія будуць перапрацоўваць у прадукты высокай партасьці апад і інш. нетаварныя фрукты, якія дасюль амаль ня выкарыстоўваюцца.

К. І.

ГАЛОЎСАЦСТРАХ „ЗМАГАЕЦЦА“ З БЕСПРАЦОЎЕМ.

Ёсьць шмат выпадкаў, калі тая ці іншая справа патрабуе тэрміновага выкананьня. Тады адміністрацыя ўжо абыходзіць закон, з прычыны тэрміновасьці. Але тэрміновасьць бывае розная, і парушэньне таго ці іншага законапалажэньня бывае ў рознай ступені. Паслухайце гісторыю.

Аднойчы машыністкі Галоўсацстраху атрымліваюць радзівае паведамленьне ад адміністрацыі:

— Нам абавязкова трэба да 15 мая надрукаваць каштарыс.

— Калі ласка, мы заўсёды гатовы, будзем працаваць звыштэрмінова.

Адміністрацыя, забываючы пра беспрацоўных машыністак, якія ёсьць на Біржы Працы, не пагадзіўшы пытаньня ад звыштэрміновых на РИК і в Інспэкцыяй Працы, індоўга думаючы, аддае работу вызвольна сваім машыністкам па 30 к. за кожную друкаваную старонку.

— Ну што-ж, справа выгадная, трэба ўзяцца за працу.

І вось, машыністкі на скарачэньні працы ў 4 в палов. гадзіны хутка бягуць дамоў пабедаць, а праз паўгадзіны прыходзяць зноў на працу, працуюць не ў машынным бюро, а ў іншым пакоі, каб ніхто не заўважыў.

Можа вам здаецца, што машыністкі працавалі штодзень па 2 гадз. звыштэрмінова, як вызначана на кодэксу законаў аб працы? Не, яны працавалі да 12 гадзіны ўночы, бо справа тэрміновая і да таго-ж вызвольная.

Групком, даведаўшыся пра тое, што звыштэрміновая праца разьлічана не на 1-2 дні, запратэставаў супроць звыштэрміновай працы і прапанаваў узяць машыністку з Біржы Працы.

Здавалася-б, што прапанова групкому вельмі добрая, карысная і маладзвая для Галоўсацстраху, як адзінкі Наркампраны.

Праходзіць тэрмін 15 мая, да якога трэба было падрыхтаваць каштарыс, а адміністрацыя з Біржы Працы, але не бярэць. Я заўтра-ж напішу аб гэтым рапарт начальніку Галоўсацстраху.

У той-жа час каштарыс для надрукаваньня быў аддадзен машыністцы Галоўсацстраху дадому.

Групком быў ашуканы. Машыністка скончыла работу ў сябе дома і атрымала за гэта 50 руб., а другая машыністка атрымала 25 руб

Ня думайце, таварышы, што пра гэтую звыштэрміновую працу ня ведала Інспэкцыя Працы: яна ведала пра гэта, часта бачыла, але нічога не казала.

Вось мы і пытаемся:

— Ці дапусьціма ашукваць групком—прафарганізацыю?

— Ці дапусьціма аддаваць работу дадому—саматужным спосабам?

Ці можна працаваць звыштэрмінова 8 гадзін у дзень?

Ці распаўсюджваецца пастанова СНК і НКП СССР на Галоўсацстрах аб мерапрыёмствах па барацьбе з беспрацоўем?

Маем надзею, што з усіх гэтых запытаньняў зробіць адпаведны вывад РСІ.

К. Аўсцер

НАТАТКІ ПРА УКРАІНУ*).

На палубе «Чубара» поўна народу. Нашы хлопцы захапіліся бяспройгрышнай лётарэяй на карысьць бяспрытульных. Маракоў выйграў іголкі, Масенко—соду для бялізны, а Нікановіч—і соду, і іголкі, ды ў дадатак люстэрка... Што-ж, справа карысная, мы павінны дапамагаць барацьбе з бяспрытульнасьцю хаця-б сваймі прагранымі капейкамі..:

— Сонца заходзіць, хлопцы, дзівецеся!—заўважыў Масенко.

А праз некалькі хвілін, так наіўна —падзіцячаму згадзіўся Кундзіш:

— Сонца і на мае...

— Ага, немае... шкадуючы, што сонца схавалася недзе далёка за Кіевам, адказаў Масенко... Цікавы сам—Тэрэнь Масенко. Ня гледзячы на яго высокі рост і шырокія плечы, твар яго такі дзіцячы, такі наіўна-шчыры. Асабліва шчырасьць лупае з яго мілых, шаўковых вачэй... Нягледзячы на тое, што яму пашоў трэці дзесятак год, ён нагадвае шасьцігадовага гульлівага сялянскага хлапчука...

А калі зьвечарэла, і вежа Кіева-Пячэрскай лаўры патанула ў далечы, мы праяжджалі міма Трыпольля. Трыпольле—звычайная вёска на страшэнна-высокіх кручах Дняпроўскага ўзьбярэжжа. Чытач мабыць ведае пра Трыпольле? А калі не, я раскажу:

Гэта было тады, калі на маладую рэспубліку саветаў з усіх бакоў наступала белагвардзейскае войска,—на усходзе—Калчак, у нас—Польшча абвясьціла вайну, а на Украіне, на поўдні—ішоў Дзянікін, гэта было тады, калі па гарадох хлеб выдаваўся па чвэртцы на чалавека ў дзень, па бонавых кніжках, а ў вёсках былі бандыты... На Украіне: Махно—у Гуляй Полі, Грыгор'еў—у Верблюшках, а Зялёны—у Трыпольлі...

1919 год. Страшны. Жудасны.

У гэтым-жа годзе, у Трыпольлі адбылася трыпольская трагедыя...

Дзевяноста трох камсамольцаў, якія баранілі Кіеў ад бандытаў Зялёнага, у адзін з дняў 1919 году ня стала...

Усіх, праўда, было 97... Прыпёртыя бандай да кручы, расстраляныя кулямі Зялёнага, усе яны прымушаны былі, папершае, адбіваць ворага і, падругое—ратавацца... Сьпераду лава бандыцкая, ззаду абрыў у... Дняпр... А гара высокая, высокая, бо калі з Дняпра глядзіш на чалавека, што стаіць на ёй, дык ён здаецца такім маленькім, маленькім...

Чэцьвера неяк выратаваліся, перапляўшы Дняпр... А дзевяноста трох на стала, усе загінулі...

А Міхайла Ратманскі, арганізатар кіеўскага камсамолу, убачыўшы, што ён абкружаны, бандытамі, застрэліў сам сябе...

Сапраўды трагэдыя, сапраўды гэраізм...

Гэраізм адданасьці, гэраізм змаганьня за заваёвы Кастрычніка...

Трыпольская трагэдыя...

Хацелася вячэраць і мы апынуліся ў прыгожанькай сталоўцы „Чубара“. Загадалі згатаваць вячэру. Чакаем. Прыходзіць кантроль, правярае білеты...

На табе! Адбірае ва ўсіх чыста білеты на права праезду і пагражае штрафам...

Пасьля ўсёй валынкі, якая адбылася на «Чубары» з-за таго, што мы седі вячэраць у сталоўцы першай клясы, маючы на руках білеты трэцяй клясы—наша парада пасажырам 3-яе клясы.

— Браточкі, ніколі не сядайце вячэраць у сталоўцы першай клясы з білетамі трэцяй клясы...

Ды ці ня час ужо адмяніць на параходах права вячэры ці абеду адпаведна білетам... А то і дзесяць год рэвалюцыі і крыўдна неяк...

Хочацца сказаць: станцыя Канів. Аказваецца ня станцыя, а прыстань...

На ўсю братву купляем усю „крамніцу“, і на чаўне Дняпром, ціхім, спакойным плывем на магілу вялікага песьняра Тараса...

Янка Момот грымануў „Могутню пісьню“...

Выспалася за кароткую летнюю ночку сонейка, лізанула воды дняпроўскія першым сваім праменем, і пусьцілася ў дзённую вандроўку вандраваць... Па-пад Дняпром жартуюць белагрудыя, стройныя чайкі, а мы памаленьку плывем, плывем...

Плывем „сярэд стэпу шырокого“ на Ўкраіне мілай, плывем, а вакол нас і «ланы шырокополы, і Дніпро, і кручы“...

А вось па адной з круч, сярод чаю высіцца чорны сілуэт помніка...

Вось, вось яна, магіла Тараса, тая самая, аб якой мы чыталі, што яна—«жывая, няўміручая». Калісьці напоўненая маўчаньнем, нібы хаваўшая заветны народны скарб, яна цяпер сьпявае гімн новага жыцьця тымі самымі словамі, якія даўным даўно былі выказаны паэтай:

І на оновленій зэмлі
Врага не будэ, супостата,
А будэ сын, і будэ маты,
І будуць люды на зэмлі...

Прычалілі да берагу...

А крыху адпачыўшы пайшлі на магілу...

Кожны год на магілу Тараса прыяжджае безьліч экскурсій, сялян, рабочых, прыяжджае аддаць уклон свайму бацьку, слаўнаму сыну Украіны...

У мінулым годзе прайшло за адно лета 14.600 экскурсантаў, за гэты год—16.000!

Не малыя лічбы. Яны кажуць аб няўміручасьці магілы...

Вось яна, вялікая магіла...

У падножжа магілы вялікая абвестка:

Грамадзяне!

Шануйце вялікую магілу, не дазваляйце самі сабе чагосьці такога, што можа пашкодзіць яе прыроднай красе і парадку. Памятайце, што гэта магіла вялікага змагара за волю работнікаў і сялян.

Шэўчэнкаўск. Акрвыканком.

Ідзем на магілу—на высокі курган, па каменных ступеньках.

На высокім п'едэстале пастаўлены бюст паэты. Цёплая казацкая шапка, кажух...

Па чатырох бакох п'едэсталу барэльефы: бюст Шэўчэнкі, Тарас у дзяка, Тарас у турме, Тарас па-пад Дняпром з кобзай...

І надпіс:

Тарас Грыгоровыч Шевченко
народывся 1814 р. 25 лютого
помер 1861 р. 26 лютого

Помнік часовы і занадта маленькі для Тараса, для вялікай магілы—кургану, для высокіх круч...

З 1925 г. магіла Тараса—дзяржаўны запаведнік. Дзевятнаццаць гэктараў зямлі запаведніку абкружае магілу, прыгожы сад вакол магілы—кургану, за садам—у нізіне—Днепр, за Дняпром стэп, а там, на небасхіле, сіняя палоска лесу...

Сыны выканалі волю бацькі Тараса і пахавалі яго як ён сам прасіў

ДРУГІ КОНКУРС

Кантора газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ абвяшчае

ДРУГІ КОНКУРС

НА ЛЕПШАГА ЎПАЎНАВАЖАНАГА, ВЫЛУЧАНАГА МЯСЦКОМАМІ ці ГРУПКОМАМІ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ Ў СПРАВЕ РАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ ГАЗЭТЫ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ».

Конкурс абвяшчаецца з 1-га жніўня і будзе цягнуцца да 31-га сьнежня г. году.

Уся прысланая ўпаўнаважанымі падпіска, пачынаючы з 1-га жніўня да 31 сьнежня, будзе залічана на конкурс. Падпіску можна зьбіраць на жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад і сьнежань месяцы г. г., а таксама і на ўвесь 1929 год.

Падпіска прымаецца ўпаўнаважанымі як за налічны разрахунак, так і ў крэдыт (крэдытная падпіска ўпаўнаважанымі праводзіцца на ранейшых умовах).

Падпіска зьбіраецца ня толькі сярод асьветнікаў, але і сярод іншага жыхарства і ўсіх устаноў і арганізацый.

УМОВЫ КОНКУРСУ:

ЗА ЗБОР ПАДПІСКІ БУДУЦЬ ВЫДАНЫ ПРЭМІІ:

За 1300 экземпляраў месяцаў і больш прэмія 160 руб.

ад 1300 да 1150	— 140 руб.	ад 400 да 300	— 30 руб.
ад 1150 да 1000	— 120 »	ад 300 да 200	— 20 »
ад 1000 да 800	— 90 »	ад 200 да 100	— бясплатна газэта «Савецкая Беларусь» на год.
ад 800 да 600	— 75 »		
ад 600 да 400	— 50 »		

Лік прэмій неабмежаваны. Такім чынам, большую прэмію могуць атрымаць некалькі ўпаўнаважаных.

Прэміі паступаюць на карысьць упаўнаважаных, а на карысьць мясцкому застаўляецца на месцы 15 проц. ад сумы падпіскі.

Вынікі конкурсу будуць абвешчаны 15 студзеня 1929 году.

ЛЁТАРЭЯ ДЛЯ ПАДПІСЧЫКАЎ.

Разам з гэтым абвяшчаецца для ўсіх падпісчыкаў лётарэя

15-ГА СТУДЗЕНЯ 1929 ГОДУ БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 50 КАШТОЎНЫХ РЭЧАЎ.

У лётарэі будуць удзельнічаць толькі індывідуальн. падпісчыкі (установы ўдзелу ня прымаюць)

Умовы ўдзельнічаньня ў розыгрышы:

Усе падпісаўшыяся пасьля 1 жніўня на 6 мес. атрымоўваюць 1 лётарэйны білет; на год—3 білеты. Лётарэйныя білеты будуць высланы ўсім падпісчыкам пасьля таго, як будуць імі прысланы квіткі аб здачы падпіскі, з дакладным адрасам, дзе бы яны ні падпісаліся: на почце ці ў упаўнаважаных канторы.

У ЛЁТАРЭІ БУДУЦЬ РАЗЫГРАНЫ НАСТУПНЫЯ РЭЧЫ:

1 валёсыпед
2 швэйныя нажныя машыны
3 фотоапараты
2 касьцюмы
2 самавары
5 прымусаў
15 насьдонных гадзіньнікаў
10 радыёпрыёмнікаў з поўным абсталяваньнем
10 камплектаў часопісі „Полымя“ на 1929 г.

У конкурсную і лётарэйную камісіі вылучаны наступныя таварышы: ад рэдакцыі—рэдактар газэты Кудзелька М., загадчык канторы Касьцюк, загадчык асьветніцкага аддзелу—Камяюк, ад ЦП саюзу працасьветы Платун і Мельнік. Апрача таго, два прадстаўнікі ад райёнаў, сабраўшых больш лік падпіскі, і прадстаўнік РСІ.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра рэарганізацыю Камісіі Законадаўчых Праэктаў пры СНК БССР у Падрыхтоўчую Камісію СНК БССР і аб яе складзе.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Камісію Законадаўчых Праэктаў пры СНК БССР рэарганізаваць у Падрыхтоўчую Камісію СНК БССР.

2. Назначыць Старшынёю Падрыхтоўчай Камісіі СНК БССР т. Кандраля, Алеся Супронавіча, Намесьнікам Старшыні т. Паручніка, Грыгора Яхімавіча, і членамі: т. т. Мароза, Міхаіла Іванавіча, Гохмана, Станіслава Маркавіча, Элькінда, Кастуся Давідавіча, Горыка, Грыгора Фэбусавіча, Абрамсона, Майсея Яхімавіча і Стракоўскага, Уладзімера Кастусевіча.

3. Падрыхтоўчая Камісія СНК БССР дзейнічае на падставе палажэньня, якое зацьвярджаецца Саветам Народных Камісараў БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галодзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР Н. Угараў.

28-га чэрвеня, 1928 г. г. Менск.

Постановление Совета Народных Комиссаров БССР

о реорганизации Комиссии Законодательных Предположений при СНК БССР в Подготовительную Комиссию СНК БССР и ее составе.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Комиссию Законодательных Предположений при СНК БССР реорганизовать в Подготовительную Комиссию СНК БССР.

2. Назначить Председателем Подготовительной Комиссии СНК БССР т. Кондраля, Александра Сафроновича, заместителем председателя тов. Поручика, Григория Ефимовича, и членами: т. т. Мороза, Михаила Ивановича, Гохмана, Станислава Марковича, Элькинда, Константина Давидовича, Горина, Григория Фебусовича, Абрамсона, Мойсея Ефимовича и Строковского, Владимира Константиновича.

3. Подготовительная Комиссия СНК БССР действует на основе положения, утвержденного Советом Народных Комиссаров БССР.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Н. Угаров.

28 июня, 1928 г. г. Минск.

Бліжэйшыя задачы камітэтаў сял. т-ваў узаемадапамогі.

Партыяй і ўладай пастаўлена перад сялянскімі т-мі ўзаемадапамогі вялікая і адказная задача па гаспадарчаму ўзьдыму бяднацка-серадняцкіх гаспадарак вёскі, шляхам дапамогі, асабліва пры правядзеньні сельска-гаспадарчай кампаніі, каб тэрпіла пласты насельніцтва не падпалі пад эканамічна-палітычны ўплыў кулацтва. Гэтыя задачы ў часе правядзеньня вясеньняй пасяўной кампаніі камітэтамі ўзаемадапамогі ў галоўным выкананы.

Падлічваючы вынікі пасяўной кампаніі, можна сказаць, што камітэты былі амаль цалкам удзягнуты ў гэтую працу праз цэлы шэраг практычных мерапрыёмстваў, як пазыка насеньня з камітэцкіх фондаў, грамадзкая дапамога сем'ям чырвонаармейцаў, чырвонагвардзейцаў, партызан, удоў і інвалідаў, грамадзкая запашка, арганізацыя пракатных і злучных пунктаў, а таксама малочных т-ваў і т-ваў па супольнай апрацоўцы глебы,—вось прароблена праца т-вамі сялянскай узаемадапамогі.

Але-ж праробленая праца толькі пачатак сельска-гаспадарчай кампаніі, сел. году і каб забяспечыць посьпех яе поўнага правядзеньня, зараз трэба распачаць падрыхтоўку да асьценьняй пасяўной кампаніі.

Якія-ж чарговыя задачы зараз стаяць перад т-вамі сялянскае ўзаемадапамогі?

Зараз трэба зьвярнуць максымум увагі на правядзеньне падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю як з камітэцкіх вучасткаў, так і з гаспадарак, ня маючых працаздольных членаў сям'і, сябраў т-ваў, сямей чырвонаармейцаў, удоў-сірот, інвалідаў вайны і тэр-армейцаў, асабліва да ўборкі сенажаці, бо зараз ужо распачынаецца ўборка ў некаторых округах. Сёлета трэба ўнікнуць выпадкаў, меўшых месца ў мінулым годзе пры зборы ўраджаю з камітэцкіх вучасткаў (гнаеньне збожжа і сена пад дажджом, перастой), што падрывае аўтарытэт камітэтаў і іх працаўнікоў. У сёлетнім годзе строгі грамадзкі кантроль павінны ўстанавіць рэвізійныя камісіі, правёўшы рашучую барацьбу з безадказнасьцю, безгаспадарчасьцю і расхлябанасьцю камітэцкіх працаўнікоў. Ваком пытаньня грамадзкай дапамогі бяднацкім гаспадаркам па ўборцы ўраджаю і падрыхтоўцы глебы да асьценьняга засеву, наладжаньня талок і інш. зараз трэба згуртаваць грамадзкую думку, пабудаваўшы практычныя пляны правядзеньня гэтага мерапрыёмства, шырока абгаварыўшы на сходах беднаты, жанчын і пленумах СТУ, увязаўшы працу з партыйнымі, камсамольскімі ячэйкамі і с-саветамі. У гэтым напрамку павінен прафільтравацца ўвесь плян асеньняй кампаніі, каб забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне яе з боку камітэтаў узаемадапамогі і ўсіх зацікаўленых арганізацый. Плянам павінны быць ахоплены ўсе вучасткі працы.

Каб мець гарантыю за пасьпяховае правядзеньне асеньняй пасяўной кампаніі, уборку ўраджаю патрэбна заразжа, улічыўшы памылкі вясеньняй кампаніі, пляны патрэбна шырока абмеркаваць на сходах СТУ і вясковым актыве, асабліва беднаты, дабіўшыся, каб ніводзін сельупаўнаважаны не застаўся ў баку ад гэтай вельмі паважнай працы.

Агульнае адказнае кіраўніцтва за пасьпяховы і шырокі ўдзел СТУ ў пасяўной кампаніі ЦКСТУ ўскладае на старшынь райённых камітэтаў.

Л. Жарын

ЗА ПАДВОЙНЫ ЎРАДЖАЙ.

Рыхтуемся да васеньняй сяўбы.

1500 цэнтн. пяткускага жыта для БССР.

БССР атрымлівае з савгасаў Цукратрэсту (Курскай губ.) 1500 цэнтн. (10 тысяч пуд.) сортавага пяткускага жыта 2-ой рэпрадукцыі. Жыта разьмяркоўваецца па ўсіх калгасах БССР.

Апроч гэтага, будзе атрымана 500 цэнтн. арыгінальнага пяткускага жыта в Энгельгардзкай вопытнай станцыі для першай рэпрадукцыі і 50 цэнтн.—з-за межаў, непасрэдна ад Пэткуса (Нямеччына).

Новая група дзяржаўных насенных культурных гаспадарак.

Сёлета ў Менскай акрузе ўтвараецца новая група дзяржаўных насенных культурных гаспадарак. У гэтую групу ўваходзяць савгасы: Сьмілавічы, Дукора, Зазер'е і Цытва з агульным плянам у 7292 гэкт. У гэтых гаспадарках будзе разводзіцца гатункоае жыта, авёс, ячмень, пшаніца, бульба, канюшына і інш.

Трэба сеяць ачышчаным насеньнем

У мінулыя гады сяляне звычайна чысьцілі ў асеньнюю сяўбу толькі пшаніцу-азімку. Сёлета зварачваецца вялікая ўвага і на ачыстку насеньня жыта ад розных сьмяцьцёвых расьлін. Зямельныя органы на мясцох атрымалі ад Наркамзему адпаведныя ўказаньні наконт плянавага правядзеньня гэтай кампаніі.

19 тысяч цэнтн. жыта для пасеву.

Непасрэдна пасьля малацьбы ў савгасах, дзе праводзіцца разьвядзеньне сартавога жыта, распачнецца апрабаваньне, г.-з. выяўленьне гатункавасьці яго. 19 тысяч цэнтн. будзе прадавацца насельніцтву праз каапэрацыю для сяўбы.

Павялічэньне азімай зьмены.

Бабруйск, 20-7. Акруговая плянавая камісія вынесла пастанову аб павялічэньні пляцу пасеву азімай зьмены ў разьмеры пляцу вымачак, якія назіраліся мінулай вясной.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 21-VII 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—60,5, куп. 4—58,5.
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—15,5, куп. 5—12,5.
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—0,6, куп. 5—04.
Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 26,09, куп. 25—99.
Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 121—50, куп. 119—50.

Апавяшчэньне.

— ЦП саюзу Белпрацасьветы даводзіць да ведама беспрацоўных настаўнікаў, што на Біржу працы паступіла групавое трэбаваньне на настаўнікаў. За атрыманьнем даведак і з заявамі патрэбна зьвяцца ў саюз да 25 ліпеня.

Галоўлітбел 302.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме Менскага гарсавету.

Паляпшэньне забясьпечаньня вадой.

Прэзыдыум Менскага гарсавету даручыў Эльводу прыняць адпаведныя меры ў адносінах Вадаканалу для паскарэньня тэмпу буреньня артэзіянскіх скважын. Разам з тым, гарсавет даручыў камгасу і прыгарадным сельсаветам наладзіць пытаньне аб скарыстаньні тых скважын, якія вытвараюць бюро садзейнічаньня, прыдгадваючы ініцыятыву насельніцтва.

Асьвятленьне Койданаўскага тракту.

Прэзыдыум гарсавету прызнаў неабходным працягнуць пабудову электрычна-асьвятляльнай сеці па Койданаўскаму тракту да аэрадрому. Гэтыя работы будуць праводзіцца Эльводам за кошт крэдытаў будучага году.

Да пабудовы памяшканьня для Біржы Працы.

У сувязі з тым, што камгас ня можа прадаставіць адпаведнае памяшканьне для Біржы Працы, прэзыдыум гарсавету пастанавіў лічыць патрэбным пабудаваць спэцыяльны будынак для Біржы. Выраішана прасіць СНК і НК Працы аб тым, каб пабудова памяшканьня для Біржы Працы была прынята на бюджэту Наркампрацы.

Шэфства над № артпалком.

Прэзыдыум гарсавету лічыць неабходным прыняць шэфства над №-ім беларускім артпалком. Прыняцьце шэфства мяркуецца наладзіць у лягерах, куды выедуць сябры гарсавету. Для ўзмацненьня харчаваньня ў дзень чырвонаармейцаў прэзыдыум адпусьціў 250 руб. Пры прыняцьці шэфства палку будзе паднесены сьцяг. Апрача таго пастаноўлена штомесяц выдаваць на культурныя патрэбы палку 75 руб. Канчаткова пытаньне аб прыняцьці шэфства будзе зацьверджана на чарговым пленуме гарсавету.

Зьняцьце за п'янства з працы.

Сэкратар першага прыгараднага сельсавету гр. Шышкін быў вялікім аматарам залить за гальштук і разам з тым пахуліганіць. Прэзыдыум гарсавету паставіў Шышкіна зьняць з працы.

Пленум гарсавету.

У чацьвер 26 ліпеня адбудзецца чарговы пленум гарсавету, на якім будзе заслухана інфармацыя аб пастанове Савнаркому па дакладу аб працы гарсавету, выраішана будзе таксама пытаньне аб прыняцьці шэфства над № артпалком і будзе заслухана справаздача Эльводу.

Пэдтэхнікумы будуць мець стабільныя праграмы

У сувязі з апошняй пастановай усебеларускай канфэрэнцыі працаўнікоў пэдтэхнікумаў, Навукова-Мэтадалёгічны Камітэт Наркамасьветы зрабіў некаторыя зьмены ў навучальным плане педагагічных тэхнікумаў.

Навучальны плян пэдтэхнікумаў запоўнены новымі прадметамі. Так, у плян уведзена методыка паліт.-асьветнай працы з насельніцтвам; асновы каапэрацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Уведзена таксама ў навучальны плян выкладаньне методыкі краязнаўства, будзе выкладацца на першым курсе пэдтэхнікуму і расейская мова.

Апрача таго, павялічаецца колькасьць гадзін па методыцах мовы, матэматыкі і прыродазнаўству. Павялічаецца згодна новага навуч. пляну колькасьць гадзін і на педагагічную практыку студэнтаў, уведзены ў плян і некаторыя іншыя зьмены.

У сувязі са зьменай у навучальным пляне будуць уведзены некаторыя карэктывы і ў праграмы пэдтэхнікуму. Гэтыя праграмы будуць лічыцца ўжо канчаткова стабілізаванымі.

К пачатку новага навучальнага году Навукова-Мэтадалёгічны Камітэт НКА мяркуе выдаць зборнік „Педагагічная асьвета“, у якім будуць зьмешчаны навучальны плян, праграмы, а таксама сыстэма правядзеньня педагагічнай практыкі ў педагагічных тэхнікумах. Разам з тым у зборніку будуць зьмешчаны пастановы апошняй усебеларускай канфэрэнцыі працаўнікоў пэдтэхнікумаў.

Новыя прафтэхнічныя школы.

У бягучым годзе Нар. Кам. Асьветы адчыняе 2 новыя прафтэхнічныя школы: школу агнятрывалага будаўніцтва і школу на вывучэньні балотных культур.

Адна з гэтых школ будзе адчынена ў Полацку, а другую мяркуецца адчыніць ў м-ку Скрыгалове, Мазырскай округі.

ПАШЫРЭНЬНЕ СЕТКІ ПРАФШКОЛ.

У сучасны момант па БССР існуе 20 прафшкол розных спэцыяльнасьцяй. З агульнага ліку 6 прафшкол будуюцца на базе сямёхгодкі, а рэшта—пяцёхгодкі. З пачатку новага навучальнага году НКА мяркуе яшчэ 7 школ перавесьці на базу сямёхгодкі,—ужо падрыхтаваны праграмы абсталяваньне і інш. для гэтага пераводу. Апрача прафшкол, на БССР працуе 9 навучальна-практыкавальных майстэрняў, у якія прымаюцца асобы скончыўшыя чатырохгадовыя школы.

З наступнага году НКА мяркуе адчыніць 2 новыя прафшколы—адну агнятрывалага будаўніцтва ў Полацку і другую—сял.-гасп. школу балотных культур у Мазырчыне.

ПРЫЁМ У ПРАФШКОЛЫ БССР.

У надыходзячым навучальным годзе будзе прынята ў прафшколах БССР каля 1200 чал.

З гэтай колькасьці ў 13 прафшколах 7-мігадовага тыпу—650 чал., у 7 прафшколах 5-цігадовага тыпу—285 чал. і ў практычных майстэрнях да 270 чал.

Пабудова маслабойнага заводу

Пабудова віцебскага маслабойнага заводу ідзе хуткім тэмпам. Ужо кончыліся работы па пабудове галоўнага корпусу.

Работы па пабудове гэтага заводу маюць быць закончаны яшчэ ў бягучым годзе. Там-жа пабудаваны 2 дамы для рабочых.

Пабудова швэйнай фабрыкі разгортваецца.

Пабудова Віцебскай швэйнай фабрыкі разгортваецца.

Ужо закладзен фундамант.

У хуткім часе будзе прыступлена да пабудовы самага корпусу будынку.

Падрыхтоўка да пабудовы трыкатажнай фабрыкі.

У сучасны момант ВСНГБ вядзе дасьледчыя геолёгічныя работы для пабудовы ў Віцебску трыкатажнай фабрыкі.

Арментыровачная каштоўнасьць пабудовы гэтае фабрыкі каля 8 мільёнаў руб.

Выпуск батрацкай газэты.

25-га ліпеня выходзіць першы нумар масавай батрацкай газэты „Беларускі батрак“ з агульным тыражом у 8.000 экз.

У дзейшым газэта будзе выходзіць рэгулярна 2 разы ў месяц.

ШАХМАТЫ № 14.

Пад рэд. А. Каспэрскага.

Эцюд Мазэля. Менск, друкуецца першы раз.



Бел. Кр c3, Лb4, Се8 па 2.
Чорн. Кр t4, Са1 пb2.

Белыя пачынаюць і выігрываюць.

ШАХМАТНА-ШАШАЧН. ЗЬЕЗД БССР.

У першай палове верасьня намечан у Менску шахматна-шашачны зьезд БССР. У працягу зьезду будуць праведзены сваборніцтвы—чэмпіянат і турніры камавд БССР.

У чэмпіянаце маюць права ўдзельнічаць усе ігракі першай усесаюзнай катэгорыі, і калі будзе магчымасьць, то будуць дапушчаны і лепшыя ігракі другой катэгорыі БССР.

Пачынаючы з гэтага аддзелу, будуць надрукаваны партыі ўдзельнікаў чэмпіянату.

Партыя іграна ў чэмпіянаце Віцебску ў 1928 г.

Бел. П. Рыжкоў, Чорн. І. Сіліч.

1. d2-d4, d7-d5, 2. Kg1-f3, Kg8-f6 3. c2-c4, c7-c6, 4. e2-e3, Kb8-d7-5. Kb1-c3, e7-e6, 6. Cf1-3, q5:c4, 7. Cd3:c4, b7-b5, 8. Cc4-b3, b5-b4, 9. Kc3-e2, Cf8-d6, 10. Фd1-c2, Cc8-b7, 11. Cc1-d2, Лa8-c8, 12. Kf3-e5, c6-c5, 13. Ke5:d7, Kf6:d7, 14. Фe2-d3, Cb7:g2, 15. Лh1-g1, Cg2-f3, 16.gg1:g7, Фq8-f6, 17. Лg7:h7, c5-c4, 18.Лh7:h8+ Фf6:h8, 19.Cb3-c4, Фh8:h2, 20.Kpe1-d1, Фn2:f2, 21. Cd2-c1, Фf2d-2, 22. Лa1-c1, Фf2-h1, 23. Kpq1-2, C4-b3, 24. a2-a3, Cd6-c7, 25. Фd3-c3: Фh1-h5, 26.Ke2-f4, Фh5-h2+-27. Cc4-e2, e6-e5, 28. d4:e5, Kd7:e5, 29. Фc3:b3, Лc8-d8+30. Kp2-c2, Cf3-e4+31.Kpc2-c3, Cc7-a5. Белыя здаліся. Энэргічна разыграна Сіліччам партыя.

Менскі дзень.

Ліквідаваць арцель «Чырвоны Кастрычнік» пастанавіў Менскі гарсавет, якім вылучана спэцыяльная ліквідацыйная камісія.

10 кап. устаноўлена плата за карыстаньне камунальнымі банямі Менскім гарсаветам для чырвонаармейцаў гарнізону.

7-хгадзінны рабочы дзень прадугледжана ўвесьці ва ўсіх прадпрыемствах ВСНГ Беларусі ў пяцёхгадовым пляне апошняга.

Замежны пажарны аўтамабіль для менскай пажарнай каманды.

Учора для Менскай пажарнай каманды прыбыў з Нямеччыны праз Управу Дзяржаўнага Гандлю БССР пажарны аўтамабіль вялікай магутнасьці, фірмы «Бенц».

Вялікая партыя гатункоай жывёлы з-за мяжы.

У бліжэйшыя дні паступіць для Белсельтрэсту з Даніі праз Управу Дзяржгандлю БССР вялікая партыя буйнай гатункоай жывёлы і птушак. Гэтая жывёла будзе разьмяркоўвацца паміж савецкімі гаспадаркамі.

Завоз селядцоў для БССР.

Па паведамленьню Нар. Кам. Гандлю БССР з салядцоў улову 1928 г. для БССР выдзелена 12.430 цэнтнэраў.

Нар. Кам. Гандлю БССР запрапанаваў Белкаапсаюзу прыняць належныя меры да завозу ў БССР паказаных колькасьці селядцоў.

Перавыбары рабачкомаў саюзу сельгаслесарабочых.

У сучасны момант па БССР праходзіць перавыбарная кампанія рабкомаў саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых. Перавыбары маюць быць закончаны ў жніўні месяцы.

У хуткім часе пачнуцца перавыбары гарадзкіх мясцкомаў.

Пабудова хлебазаводу.

Рэспубліканскаму інжынэру паступіў праэкт пабудовы новага хлебазаводу ў Гомелі.

Завод будзе прапаваць у 2 зьмены з вытворчасьцю 1.600 пуд. хлеба.

Да пабудовы гэтага хлебазаводу будзе прыступлена яшчэ ў бягучым годзе.

Завод будзе абсталёван замежнымі машынамі.

Посьпех Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру.

За апошнія 6 месяцаў Дзяржаўны Вандроўны Тэатр пад кіраўніцтвам Галубка даў 126 спэктакляў, якімі абслужана 80.000 гледачоў, пераважна вясковай беднаты.

Тэатр наведаў самыя глухія куткі Мазырчыны і Полаччыны.

Што слухаць па радыё.

СУБОТА, 21 ЛІПЕНЯ.

7—00—7—25 Беларускі піянэр па радыё.
7—25—8—05 Беларуская радыёгазэта з латыскім аддзелам.
8—05—8—30 Тэхнічная адукацыя моладзі (Джэлюк).
8—30—8—45 Музычны адначынак.
8—45—9—10 Гутарка агранома аб выніках пасяўной кампаніі ў Беларусі.

НЯДЗЕЛЯ, 22 ЛІПЕНЯ.

11—00—11—40 Рэлігія, як зброя нацыянальнай варожасьці і адкуль узялася рэлігія ў кожнай нацыянальнасьці (даклад зробіць праф. Пакроўскі).
11—40—1—00 Піянэрскі ранішнік і дзіцячы канцэрт.
7—00—7—30 „Чырвоная Зьмена“ па радыё.
7—30—8—00 «Беларуская Вёска» па радыё з польск. аддз.
8—00—8—30 Радыёаматар па радыё.
8—30—9—00 Канцэрт.
9—00—9—25 Даклад, прысьвечаны 25 годзьдзю другога зьезду РС-ДРП (Канакоцін).
9—25—11—30 Канцэрт.

БЕЛАРУСКІ СТУДЭНТ.

20 проц. СКОНЧЫУШЫХ ПЭДФАК НЯ ВЕДАЮЦЬ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ.

Месяц таму наперад адбыўся чацьверты выпуск студэнтаў педагагічнага факультэту Б. Дз. Ун-ту. Пару сот студэнтаў вясною здалі апошнія залікі і гэтакім чынам скончылі ўнівэрсытэцкі курс навучаньня. Новыя кадры працаўнікоў—грамадаведаў, прыродазнаўцаў, матэматыкаў і літаратараў заразъ уліваюцца ў асьветніцкія шэрагі. Усе скончыўшыя ўжо размеркаваны на працу. Попыт на новых працаўнікоў значна большы, чым лік скончыўшых.

Гэты выпуск, бязумоўна, даў лепш падрыхтаваных працаўнікоў, чым мінулыя выпускі. Студэнтам выпуску гэтага году прыходзілася вучыцца, адносна, у больш нармальных умовах, хаця і ў гэты час мы мелі штогод вымену навучальных плянаў, шматпрадметнасьць і інш. недахопы. Сярод выпускнікоў мясцца значны лік былых настаўнікаў, для якіх падфак зьявіўся школай грунтоўнай перападрыхтоўкі, школай падвышэньня сваёй кваліфікацыі. Абсалютная большасьць выпускнікоў прыймала актыўны ўдзел ў грамадзкай працы на ліпунктах, у Чырвонай арміі і г. д. Будучы на малодшых курсах—гэта быў самы актыўны курс, які напаўняў усе нашы арганізацыі. Здабытыя ў гэтым напрамку практычныя навыкі выпускнікі будуць выкарыстоўваць на месцы ў сваім штодзённым жыцьці.

Застаецца толькі пажадаць, каб масцовыя арганізацыі і працаўнікі ўважліва сустрэлі настаўнікаў, падрыхтаваных у кузні беларускай асьветы—БДУ і ўзброеных неабходнымі спэцыяльнымі марксысока-ленінскімі ведамі і матадамі, бо ў мінулыя гады мы назіралі выпадкі, калі замест дапамогі на першых ступенях працы новага працаўніка, апошні сустракаў ня ўважлівыя адносіны, а іншы раз і нават перашкоду.

Разам з гэтым неабходна адзначыць і на адзін вялікі недахоп у выпускніку—гэта вельмі слабае веданьне беларускай мовы значнаю частнаю іх.

Перад выпускам падводзіліся вынікі беларусізацыі пэдфаку ў адносінах да аканчаючых унівэрсытэт. Усе выпускнікі павінны былі пасьпяць на беларускай мове пісьмовую працу пры камісіі. Калі-б зараз сабраць усе гэтыя працы і выдаць іх асобным зборнікам, дык ён быў-бы лепшым аргументам супроць фармальнай „пропаганды“ беларусізацыі, лепшым пакаёчкам дрэннай пастаноўкі беларусізацыі ў БДУ. Па гэтых пісьмовых працах робіцца відавочным, што некаторыя прыходзяцца пісаць набеларуску ўпершыню; праўда, гэтакія—адзінкі, але і яны ёсьць.

Калі ваат навярхоўна праглядзець памянёныя працы, дык мімаволі ўзьнікае пытаньне дзе, дзеліся лекцыі дацэнтаў Лёсіка, Багдановіча, Воўк-Левановіча на школьнай граматыцы, навуковай граматыцы і інш. у працягу 3-х гадоў, дзе наогул уся беларусізацыя унівэрсытэту? Што яны практычна далі? Сапраўды, чым тлумачыць вось такія «перлы», як:—„значная значнасьць“, „революція“, „так сама“, „выходзя з вышэйсказанага мы павінны прыстаць“, ці напрыклад ямчо—„у трэцяць шесть гадоў ім было утворано надарожжа кругом сьвета, у які час ён вытвараў расліны розных стран, а посля гэтага яшчэ доўга працаваў шляхам дасьлочім“, альбо «вытворчасная камісія» і «павяленьне ў сусветны прастор твораў Дарвіна»...

Гэтыя „перлы“ не вынаходзтва, у іх магчыма дзесяткамі знайсьці ў 20 проц. (прыблізна) усіх прац. Наогул-жа без памылак нима амаль ніводнай працы. А вось дзьма студэнткі сацыяльна-гістарычнага адзяленьня—Іваньковіч і Рыжіна, дык вусім каб лягчэй было, калі была дадзена тэма:—«Падзеі паўстаньня 1863 г. на Беларусі», адчынілі „Гісторыю Беларусі“ Ігнатоўскага, старонку—117 і «давай працаваць» ад пункта да пункта. Мы прыводзім гэты факт таму, што супроць гэтакіх увзбраючых паводзін арганізацыі ун-ту па прыняці ніякіх крокаў, а гэтыя-ж студэнткі зараз будуць ужо настаўніцамі.

Необходна яшчэ зазначыць, што частка прац на гэтакія тэмы, як—«эканамічная палітыка сав. улады», «Кастрычнік на Беларусі», «нацыятальне» і „Чаму так актуален для нас у сучасны момант лёзунг—„культурнай рэвалюцыі“ і г. д. складаецца з 100—120 слоў, бо больш у некаторых «не хапае» беларускіх слоў—гэта за тры гадзіны, у працягу якіх даваладзецца пісаць.

Вынікаў мы рабіць ня будзем, пакай зробіць гэта праўленьне унівэрсытэту і Наркамасьветы. Пакай, хто зацікавіцца і пачытае гэтыя пісьмовыя працы.

Нам здаецца толькі, што час ужо, каб беларусізацыя прасякла на практыцы жыцьцё ня толькі ў «сусветны прастор» пропаганды розных справаздач, а е і ў сапраўднае унівэрсытэцкае жыцьцё, ува ўсю яго штодзённую працу. „Дасьпрэньні“, якія паўнуць у справаздачах, пакуль яшчэ не пацьвярджаюцца на практыцы.

Патрэбна было-б перад пачаткам навучальнага году, пры пераводзе на апошні курс (а можа і для ўсіх студэнтаў) праверкі праверку ведаў беларускай мовы і зрабіць канкрэтныя крокі да палепшаньня пастаноўкі ўсёй гэтай справы.

Больш увагі практыцы, а на толькі фэрмальна!

Л. Мухн.

БОЛЬШ УВАГІ ПАТРЭБАМ ПРАЛЕТАРСКАГА СТУДЭНЦТВА.

Справа падвышэньня кваліфікацыі новых спэцыялістых, канчаючых нашы ВНУ і тэхнікумы—высунута ў апошні час савецкай грамадзкасьцю ў лік важнейшых задач. Аднак гэты абавязак нашай вышэйшай школы, каб павялічыць прадукцыйнасьць працы, даць у сваіх мурох студэнту максымум неабходных ведаў, укіраецца ў цэлым шэраг перашкод, не даючых магчымасьці ажыцьцёвіць гэта. Адной з гэтых перашкод зьяўляецца матар'яльнае становішча студэнцтва.

Матар'яльнае становішча пралетарскага студэнцтва да гэтага часу яшчэ вельмі і вельмі цяжкае.

У сувязі з павялічваючайся з кожным годам пралетарызацыяй вышэйшай школы, у шэрагі пралетарскага студэнтва ўсё болей прыбываюць выхадцы з рабоча-сялянскіх колаў, дзінай крыніцай да існаваньня ў якіх зьяўляецца стыпэндыя, тым ня менш, ня гледзячы на ўзрост протэндэнтаў на стыпэндыю, колькасьць іх за апошнія гады стабілізавана. Гэткім чынам няма магчымасьці задаволіць стыпэндыяй усіх тых, хто яе патрабуе і па свайму сацыяльнаму і матар'яльнаму становішчу мае на гэта права.

Штогод мы маем некаторы лік прынятых у лік студэнтаў, але не атрымаўшых стыпэндыі, вельмі многа і яны, ня маючы магчымасьці вучыцца, пакідаюць вышэйшую школу і накіроўваюцца дамоў, зноў да сваёй працы.

Аднак і атрымаўшы стыпэндыю ня можа нармальна вучыцца: стыпэндыя не складае нават пражытачнага мінімуму. Перад студэнтам—стыпэндыятам стаіць складаная задача як разьмеркаваць стыпэндыю хаця на мінімальныя патрэбы? Тут вялікі рэжым эканоміі не дае жадных вынікаў. Зусім відавочна, што стыпэндыі не хапае на пражыцьцё, а іншых сродкаў да існаваньня ў пралетарскага студэнта няма. Гэта прымушае студэнта адрывацца ад сваёй непасрэднай задачы—вучобы, у мэтах шуканьні дадатковых крыніц існаваньня,—той ці іншай працы.

Зараз, калі ўва ўсёй шырае стаіць пытаньне аб кваліфікацыі і наогул падрыхтоўцы новых чырвоных спэцыялістых, мы павінны паставіць пытаньне і аб павялічэньні матар'яльнай дапамогі студэнцтву, аб павялічэньні стыпэндыі, каб стварыць належныя ўмовы працы і вучобы пралетарскаму студэнтству. У сучасны момант складаецца кантрэрыс на будучы год. Павялічэньне стыпэндый павінна найсьці ў ім адбітак. Разам з гэтым вусім зразумела, што павялічэньне стыпэндыі ў 19 руб. для ВНУ на 1 ці 2 руб. ня вырашыць пытаньня. Необходна павялічыць стыпэндыю мінімум да 25 руб., ваат і з гэткай стыпэндыяй студэнцкі кантрэрыс прымушан будзе выключыць гэткія параграфы, як пабыцьцё вопраткі, абутку і г. д.

Яшчэ горш абстаіць справа ў тэхнікумах, дзе стыпэндыя складае ўсяго 13-15 руб., прычым досыць часта, з прычыны недастатковага ліку стыпэндый, іх зьяляць на часткі, так што студэнт атрымлівае толькі палову стыпэндыі—вось і жыві як хочаш! Нам здаецца, што час пакажыць канец гэтакаму дзяленьню, выходзячаму з прынцыпу—сусім на трохі».

Баланс студэнта ўвесь час пасыўны. Гэта адбіваецца на якасьці вучобы, на здароўі. Мы назіраем гэткі факт, што з узростам курсу павялічваецца лік хворых з прычыны напружанай працы, пры недастатковым харчаваньні і дрэнных квэтэрных умовах. Праведзены ўсебеларускі агляд студэнцкіх інтэрнатаў выявіў надзвычайна дрэнныя жыльёвыя ўмовы, у якіх знаходзіцца студэнтства. Перагружанасьць інтэрнату, дрэннае абсталяваньне, адсутнасьць мінімальнай неабходнай нормы кубатуры на чалавека—вось у якіх умовах часта прыходзіцца жыць і вучыцца, каб стаць добрым спэцыялістам. Необходна павялічэньне плошчы студэнцкіх інтэрнатаў—аднак гэта справа далей слоў ня ідзе.

У гэтым годзе нават пагоршыліся ўмовы разьезду студэнтаў на вакацыі з прычыны ліквідацыі літароў на праезд на чыгунцы з 75 проц. скідкай.

Пры гэткіх умовах барацьба за здаровы быт таксама ня можа даць належных вынікаў. Усё гэта настойліва высоўвае пытаньне аб павялічэньні асыгнаваньняў на матар'яльныя патрэб